Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
21 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 117 (28733)

## ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ — ЛІК МНОЖНЫ

**У Беларусі 2018—2020 гады пройдуць пад знакам Года малой радзімы. Адпаведны Указ № 247 падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

Дакумент прыняты ў мэтах стымулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў насельніцтва, захавання гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны. Савету Міністраў даручана сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскую праграму мерапрыемстваў па гэтай тэматыцы да 2020 года, а таксама забяспечыць каардынацыю дзейнасці дзяржаўных органаў і іншых арганізацый па выкананні названай праграмы.

### ЛІЧБА ДНЯ

**Амаль 7 тысяч**

*балельшчыкаў па стане на ўчарашні дзень перасеклі мяжу Беларусі падчас ЧС-2018 у Расіі. А дакладней — 6,8 тысячы, з якіх каля 6,4 тысячы на ўезд і 425 — на выезд. Сярод балельшчыкаў больш за ўсё палякаў, аргенцінцаў і грамадзян Перу — 2,1 тысячы, 527 і 333 чалавекі адпаведна. Усяго ў краіну заехалі аматары футбола з 87 краін, у тым ліку з Каморскіх астравоў у Індыйскім акіяне, з астраўной дзяржавы Трынідад і Табага ў Карыбскім моры, з Гвінеі-Бісау, што на заходнім узбярэжжы Афрыкі.*

### КОРАТКА

- З 27 чэрвеня стаўка рэфінансавання зніжаецца з 10,5 % да 10 % гадавых, стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці — з 11,75 % да 11,5 % гадавых.
- **У Беларусі прапануюць увесці механізм рэгістрацыі гранічных адпускных цэн вытворцаў на асобныя групы лекаў.**



- Больш за 40 новых камбайнаў папоўняць сёлета парк збожжаўборачнай тэхнікі Брэсцкай вобласці.
- **Футбольны фрыстайлер з Новалукомля Аляксандр Васькін прымаў удзел у адкрыцці чэмпіяната свету па футболе ў Расіі.**
- Больш за 100 бегуноў прымуць удзел 23 чэрвеня ў першым паўмарафоне на Аўгустоўскім канале.
- **Манеты часоў Рымскай імперыі і Візантыі знайшлі ў тайніку «Мерседэса» гродзенскія мытнікі.**



# Я ПАДАРУ ТАБЕ СОНЦА...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёння самы доўгі дзень у годзе — дзень летняга сонцастаяння. Мікіта ФРАЛОЎ і Яна АНГУР — сёлетнія навагрудскія выпускнікі, яны назіраюць заход сонца з Замкавай гары старажытнага горада.**

■ Прыёмная кампанія — 2018

## У ІНТАРЭСАХ АБІТУРЫЕНТАЎ

### Што адбываецца з работамі ўдзельнікаў ЦТ

**Колькі б ні папярэджвалі абітурыентаў пра адказнасць за парушэнні правілаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, але традыцыйна пасля здачы чарговай дысцыпліны прыходзіць інфармацыя пра тое, што з ЦТ зноў былі выдалены некалькі чалавек.**

Не стаў выключэннем і гэты год: так, з экзамену па беларускай мове выдалілі дваіх, ад іспыту па рускай мове былі адхілены пяцёра, траіх адправілі за дзверы з тэста па граматазнаўстве і двое пазбавіліся магчымасці ўдзельнічаць далей у прыёмнай кампаніі на ЦТ па матэматыцы. Галоўныя прычыны — спробы скарыстацца шпаргалкамі і пранос у экзаменацыйныя аўдыторыі мабільных тэлефонаў. Даходзіць і да абсурду — так, адна з абітурыентак вырашыла зрабіць у экзаменацыйнай аўдыторыі... сэлфі, каб, па яе словах, «разрадзіць абстаноўку». Наступствы не прымусілі сябе доўга чакаць. Экзаменатары гумар не ацанілі, і для дзяўчыны прыёмная кампанія скончылася. Парушальнікі не могуць пераздаць прадмет у рэзервовы дзень.

СТАР. 2

■ Нерухомасць: тэндэнцыі

## ДАЧЫ І КАТЭДЖЫ: КАЛІ СКЛАДАНА ПРАДАЦЬ — ТО МОЖНА ЗДАЦЬ

### Загарадных дамоў на рынку так зашмат, што іх не купляюць нават па сабекошце



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Існуе меркаванне, што надыход летняга сезона актывізуе пакупнікоў загараднага жылля, дзякуючы чаму можна разлічваць на больш высокую цану продажу. Але эксперты прытрымліваюцца іншага меркавання — попыт на дачы і дамы прысутнічае цэлы год, а вось цэны з кожным годам паступова зніжаюцца. У дадатак з'явілася яшчэ адна тэндэнцыя — прыхільнікі бавіць выхадныя за горадам усё часцей імкнуцца арандаваць лецішча, чым набываць яго ва ўласнасць.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
18117

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Дзяржава і бізнес

# ЯК ЗАХАВАЦЬ ЭКАЛОГІЮ І СТВАРЫЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ?

## Прадпрымальнікі адзначаюць нізкую актыўнасць органаў мясцовага кіравання пры вырашэнні канфліктаў паміж грамадскасцю і інвестарамі

**Стварыць умовы для інвестара, пабудаваць прамысловую вытворчасць без шкоды для экалогіі і захаваць інтарэсы грамадскасці. У сталіцы прадстаўнікі дзяржорганаў, кіраўнікі асноўных бізнес-саюзаў, члены грамадскіх аб'яднанняў абмяркоўвалі, як захаваць баланс інтарэсаў грамадзян, інвестараў і дзяржавы і пры гэтым палепшыць інвестыцыйную прывабнасць краіны.**

### Баланс інтарэсаў

Па словах **старшыні рэспубліканскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Аляксандра ШВЕЦА**, бізнес-саюзы сыходзяцца ў меркаванні, што беларускае інвестыцыйнае заканадаўства прапрацавана на добрым узроўні. Разам з тым яно ўсё яшчэ патрабуе карэкціроўкі.

«Заканадаўства выкарыстоўваецца досыць актыўна. З недахопаў можна адзначыць пытанні правапрымяняльнай практыкі. Таксама, калі мы аналізуем тыя праблемы, з якім сутыкаюцца інвестары пры стварэнні сваіх праектаў, мы заўважаем, што змяняецца сітуацыя з фарміраваннем грамадскай думкі», — растлумачыў Аляксандр Швец.

Паводле ацэнак бізнес-саюзаў, грамадзян сёння істотна цікавіць экалагічная бяспека. Пры рэалізацыі інвестпраектаў беларусы часта глядзяць за тым, ці прывядзе яна да змены іх звыклага жыцця і да пагаршэння экалагічнай сітуацыі. Часам здараецца так, што грамадзяне не даўяраюць інвестарам, нават нягледзячы на тое, што яны праходзяць усе неабходныя праверкі інстанцый.

Вядома, што ў Дэкрэце № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для ажыццяўлення інвестыцый» прапісаны моманты, якія рэгулююць дзейнасць інвестара па забеспячэнні бяспекі здароўя грамадзян і экалогіі. Дзяржорганы папярэдне праводзяць ацэнку інвестпраекта і ў выпадку адпаведнасці ўзгодняць будаўніцтва.

«Далей інвестар ацэньвае рызыкі і прымае рашэнне ўкладваць сродкі ў нашу краіну. Як правіла, улічваюцца экалагічныя фактары і многае іншае, што можа стварыць нязручнасць для грамадзян. Аднак, здараецца так, што грамадскасць з-за боязі і недаверу можа ўскладніць жыццё інвестару. Мы лічым, што дзяржава павінна больш актыўна займацца такімі выпадкамі і ўстараняць усе магчымыя парушэнні, выступаць у ролі арбітра пры спрэчках», — адзначыў Аляксандр Швец.

Таксама на думку старшыні рэспубліканскага саюза прамыслоўцаў, ёсць асцярогі, што ў некаторых сітуацыях грамадская думка можа фарміравацца стыхійна дзякуючы тэхнолагам, якія робяць гэта з улікам сваіх мэт, не грунтуючыся на патрабаваннях заканадаўства.

«Місія дзяржавы як рэгулятара захаваць баланс законных інтарэсаў грамадзян з фарміраваннем законнага інвестыцыйнага асяроддзя. Мы бачым, што стварэнне такога асяроддзя ідзе не ў поўнай меры. Асаблівая роля ў вырашэнні гэтага пытання ляжыць на мясцовых органах кіравання», — растлумачыў Аляксандр Швец.

Прадстаўнікі бізнесу лічаць, што грамадзян трэба больш інфармаваць, каб пазбегнуць канфліктных сітуацый. У тым ліку і тлумачыць людзям перспектывы развіцця таго ці іншага рэгіёна з улікам стварэння новых прадпрыемстваў і дадатковых працоўных месцаў.

### Развіццё рэгіёна ў прыярытэце

Як у сваю чаргу адзначыў **намеснік міністра эканомікі Дзмітрый МАТУСЕВІЧ**, з практыкі асобных раёнаў вядома, што калі няма вытворчасці, то патэнцыял экалогіі таксама складана выкарыстоўваць для эканамічнага развіцця. У краіне ёсць маланаселеныя пункты, дзе не існуе вытворчасці і якія не маюць асаблівай прывабнасці для інвестара, таму што з гэтых мясцін людзі рухаюцца ў больш буйныя гарады.

«Мы разумеем, што для ўкаранення інвестпраектаў у эканоміку яны павінны адпавядаць канкрэтным крытэрыям. Некаторыя крытэрыі экалагічнага характару ў Беларусі нават больш жорсткія, чым у Еўрасаюзе. Таму перад тым як інвестар прыходзіць да нас, ён вывучае сітуацыю. Разам з тым на мясцовым узроўні трэба сапраўды лепш кантраляваць выкананне ўсіх дамоўленасцяў і захаванне балансу інтарэсаў», — адзначыў Дзмітрый Матусевіч.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што меркаванне насельніцтва павінна ўлічвацца, і мясцовым уладам трэба даваць адказы на ўсе спрэчныя пытанні. Пры прызначэнні дадатковых праверак павінны працаваць усе эксперты, якія здольныя ацаніць усе рызыкі і прыняць канчатковае рашэнне, зводзячы да мінімуму бюракратычныя моманты.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СУКУПНЫ КАПІТАЛ НАЙБАГАЦЕЙШЫХ ЛЮДЗЕЙ ПЕРАВЫСІЎ $70 ТРЛН



Сусветная эканоміка, нягледзячы на папярэджанні інвестараў і аналітыкаў, расце, а разам з ёй павялічваецца і колькасць асоб з высокім узроўнем уласнага капіталу (HNWI, high-net-worth individual). Летась іх сумарны капітал вырас на 10,6 працэнта, упершыню перавысіўшы адзнаку ў $70 трлн. Пра гэта гаворыцца ў падрыхтаваным кансалтынгавай кампаніяй Capgemini справаздачы World Wealth Report 2018, якая паступіла ў Forbes. Па прагнозах кампаніі, да 2025 года глабальнае багацце HNWI перавысіць $100 трлн. Пры гэтым вырас не толькі сумарны капітал багатых людзей на ўсім свеце, але і іх колькасць. У Індыі, напрыклад, яна павялічылася адразу на 20 працэнтаў — з 219 да 263 тысяч.

### ЗША ВЫХОДЗЯЦЬ З САВЕТА ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Злучаныя Штаты заявілі, што выходзяць са складу Савета ААН па правах чалавека. Прадстаўнік ЗША пры ААН Нікі Хейлі назвала Савет «крывадушнай арганізацыяй, якая клапоціцца толькі аб сваіх уласных інтарэсах і ператварае правы чалавека ў насмешку». Савет ААН па правах чалавека, які базуецца ў Жэневе, быў створаны ў 2006 годзе і часта падвяргаўся крытыцы за тое, што ў яго склад уваходзяць краіны з сумненнай рэпутацыяй у галіне правоў чалавека. Камісар ААН па правах чалавека Зэйд Раад аль-Хусэйн, сказаў, што засмучаны, але не здзіўлены рашэннем Вашынгтона.

### БАЗАВЫ КОШТ ШЭНГЕНСКАЙ ВІЗЫ ПАВЯЛІЧЫЦЦА ДА 80 ЕЎРА

Камітэт Еўрасаюза на ўзроўні пастаянных прадстаўнікоў ухваліў праект рэформы шэнгенскага візавага кодэкса. Пра гэта гаворыцца ў апублікаванай заяве Савета ЕС. Ён павінен даць еўрапейцам больш дзейсныя сродкі кантролю межаў для процідзеяння наплыву мігрантаў, а таксама забяспечыць некаторае спрашчэнне працэдуры выдачы віз «добрапрыстойным падарожнікам». Аднак плата́й за гэта стане павышэнне базавай цаны шэнгенскай візы з €60 да €80, а для краін з дзеючымі пагадненнямі аб спрашчэнні візавага рэжыму з ЕС — з €30 да €40. «Новыя правілы прадугледжваюць лепшыя ўмовы атрымання віз для законных падарожнікаў. Яны даюць магчымасць падачы дакументаў на візу максімум за шэсць месяцаў і не менш чым за 15 дзён да даты паездкі, электроннага запаўнення і падпісання анкет, выразна вызначаюць, якія краіны павінны выдаваць візу ў выпадку паездкі па некалькіх дзяржавах, уводзяць гарманізавана сістэму выдачы шматгадовых віз для асоб з чыстай візавай гісторыяй з магчымасцю паслядоўнага павелічэння тэрміну, на які выдадзена віза, з аднаго да пяці гадоў», — адзначаецца ў дакуменце.




### У СВЕЦЕ ВЫРАСЛА КОЛЬКАСЦЬ БЕЖАНЦАЎ

Больш за 68 мільёнаў чалавек па ўсім свеце з-за ваенных канфліктаў, гвалту і ганенняў былі вымушаныя пакінуць свае дамы ў 2017 годзе. Гэтыя звесткі апублікавалі эксперты ААН. Вярхоўны камісар ААН Філіпа Грандзі заявіў, што да праблемы вымушанага перамяшчэння людзей у свеце патрабуецца «новы, значна больш усёабдымны падыход». «Адказам на міграцыйны крызіс павінны стаць не паніка і не закрыццё межаў і гаваняў, а міжнароднае супрацоўніцтва з мэтай пошуку рашэнняў. Калі гэта адбудзецца, праблема будзе кіруемай», — падкрэсліў Грандзі. Самую вялікую ў свеце групу вымушаных перасяленцаў (больш за 12,6 мільёна чалавек) складаюць сірыйцы. Як адзначаецца ў дакладзе, сярод краін, якія прымаюць больш за ўсё бежанцаў, толькі адна еўрапейская дзяржава (Германія) увайшла ў першую дзясятку. Лідарам у гэтых адносінах з'яўляецца Турцыя.

Падрабязнасці

# Што і каго ўбачым на парадзе

**3 ліпеня, у Дзень Незалежнасці, ужо па традыцыі каля стэлы «Мінск горад-герой» адбудзецца парад войскаў Мінскага гарнізона. Па праспекце Машэрава парадным строем пройдзе пешая калона. 18 разлікаў складуць больш за тры тысячы ваеннаслужачых.**

Гэта выхаванцы Мінскага суворааўскага ваеннага вучылішча, вайскоўцы Ваеннай акадэміі, ваенна-тэхнічнага факультэта ў БНТУ, 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады, 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады, 11-й асобнай механізаванай брыгады, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў МУС, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, зводнай роты ганаровай варты, а таксама зводны аркестр Узброеных Сіл.

Цікавінкай парада стане тое, што падчас яго пройдуць зводныя парадныя разлікі, якія складаюцца з жанчын-ваеннаслужачых і навучэнцаў кадэцкіх класаў і спецыялізаваных ліцэяў. Прыедуць да нас і госці з Расіі. Таксама чакаецца ўдзел і ваеннаслужачых Народна-вызваленчай арміі Кітая.

Акрамя таго, каля стэлы праедуць і 250 адзінак баявой тэхнікі, якія складуць 23 парадныя разлікі. На чале калоны — легендарны танк Перамогі Т 34-85. За ім пойдзе тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні беларускага войска.

Што ж уваходзіць у іх склад? Танк Т-72Б, баявыя машыны пяхоты БМП-2, бронетранспарцёры БТР-70МБ і БТР-80; супрацьтанкавы ракетны комплекс «Штурм»; самаходныя гаўбіцы «Мста-С» і «Гваздзік»; МАЗ-6317 з 152-міліметровай гаўбіцай «Мста-Б»; 152-міліметровыя самаходныя гарматы «Гіяцынт-З»; мабільныя зенітныя артылерыйскія комплексы «Зеніт»; МЗКЦ з 120-міліметровымі мінамётамі «Нона М1»; мінамётныя комплексы «Сані»; сістэмы рэактыўнага залпавага агню «БелГрад», «Смерч» і «Паланэз»; зенітныя ракетныя комплексы С-300ПС, «Аса-АКМ» і «Тор-М2»; ракетны комплекс «Кропка»; аўтамабілі «Волат», бронеаўтамабілі «Цмок», мабільны беспілотны авіяцыйны комплекс «Бусел-10».

Ваенны парад скончыцца плац-канцэртам роты ганаровай варты. Таксама выступіць зводны ваенны аркестр.

Першая рэпетыцыя парада адбудзецца ў Мінску ўвечары 23 чэрвеня. Другая — увечары 28-га.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

# У ІНТАРЭСАХ АБІТУРЫЕНТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння ўсіх абітурыентаў, якія здавалі ЦТ па рускай і беларускай мовах, цікавіць, калі з'явяцца вынікі экзамену. Звычайна на праверку работ па самай масавай дысцыпліне — рускай мове — ідзе восем дзён. Але вынікі ЦТ па беларускай і рускай мовах агучваюцца заўсёды адначасова.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў тлумачаць: працэс праверкі тэставых работ стрымлівае верыфікацыя, якая ажыццяўляецца выключна ў інтарэсах абітурыентаў. Праблема ў тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стопрацэнтную якасць пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. Між іншым, акуратнасцю абітурыенты не вылучаюцца, а многія і ўвогуле замест друкаваных літар выкарыстоўваюць пропісь. Некаторыя ўмудраюцца дапусціць памылкі ў рэгістрацыі ва ўсіх трох тэставых работах. Быў выпадак, калі адзін абітурыент пры напісанні ўласнага імя, імя па бацьку і прозвішча дапусціў аж сем памылак. А ёсць абітурыенты, якія ўвогуле з-за хвалявання забываюць запоўніць у бланку рэгістрацыйную частку.

Пасля пераводу рукапісных бланкаў у электронны фармат над імі пачынаюць працаваць верыфікатары, якія дапамагаюць машыне разабраць «каракулі» ў бланку. Электронная выява раздзяляецца на частку рэгістрацыі і частку адказаў. Адны аператары правяраюць толькі рэгістрацыю, а другія — толькі адказы і нават не ведаюць, чыя работа знаходзіцца перад імі на экране.

Кожны бланк праходзіць як мінімум трайную праверку вачамі, і кожны раз яго «чытае» новы верыфікатар. Аператары выдаляюць і ўвесь бруд: напрыклад, абітурыент выпадкова чыркнуў ручкай, і, каб камп'ютар не залічыў яму няправільны адказ, гэта з элетроннай выявы прыбіраецца. Здараецца, што абітурыент з-за хвалявання дзве літары напісаў у адной клетачцы. Іх таксама расстаўляюць па сваіх месцах.

Пры гэтым камп'ютарная праграма фіксуе абсалютна ўсе ўмяшанні верыфікатара. Не варта думаць, што аператар (верыфікатар), які сядзіць за камп'ютарам, можа нейкім чынам умяшацца ў праверку работ.

І яшчэ адзін важны момант — адказаў да тэставых заданняў аператары не ведаюць. Адказы рыхтуюцца толькі пасля таго, як работы ўдзельнікаў ЦТ прайшлі ўсе праверкі. Акрамя верыфікацыі (распазнавання рукапісных выяў), прадугледжаны яшчэ і тры апаратныя праверкі. Калі адказы, нарэшце, з'яўляюцца, яны ўносяцца ў камп'ютарную праграму, і пасля націскання адной кнопкі праз долі секунды становяцца бачнымі ўсе вынікі.

Балы цэнтралізаванага тэсціравання можна будзе даведацца, калі падпісацца на sms-паведамленне, або ў асабістым кабінеце на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

# АДЛІК ПАЙШОЎ

## Да II Еўрапейскіх гульняў застаўся роўна год

**Чакаецца, што ў самым буйным для нашай краіны і ўсяго кантынента мультыспартыўным мерапрыемстве 2019 года будуць прадстаўлены найлепшыя спартсмены ў 15 відах спорту і 23 дысцыплінах. У спаборніцтвах прыме ўдзел больш за восем тысяч афіцыйных прадстаўнікоў 50 краін Еўропы, якія разыграюць больш за 200 камплектаў узнагарод. Напярэдадні пачатку афіцыйнага адліку часу да адкрыцця намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ *(на фота)* пагутарыў з дэлегацыяй вядучых расійскіх СМІ і расказаў ім аб арганізацыйных момантах і асаблівасцях правядзення спаборніцтваў.**


Фота БелТА.

Гаворачы пра гатоўнасць сталіцы да II Еўрапейскіх гульняў, Анатоль Котаў адзначыў, што работа над спартыўнай інфраструктурайужо практычна завершана. Фактычна справіліся з рэканструкцыяй і будаўніцтвам некалькіх спартыўных аб'ектаў. Аднак, для таго каб яны змаглі паўнавартасна функцыянаваць, неабходна стварыць вялікую колькасць часовай інфраструктуры для валанцёраў, журналістаў, удзельнікаў. Таксама важна забяспечыць неабходны ўзровень бяспекі.

«З пункту гледжання пастаяннай інфраструктуры, у нас 99 % гатоўнасць. З пункту гледжання інфраструктуры забеспячэння, мы цяпер знаходзімся на этапе планавання. Мы выбіраем найлепшыя кампаніі, якія прапануюць свае паслугі па арганізацыі падобных мерапрыемстваў», — паведаміў Анатоль Котаў.

Таксама ён расказаў, што арганізатары зараз плануюць закупіць транспарт, вылучыць для яго палосы на праезнай частцы. Акрамя таго, паводле яго слоў, на найбліжэйшую перспектыву плануецца аператыўна дарабіць усе планы, якія аргкамітэт мае з рознымі ведамствамі і органамі дзяржкіравання.

«У падобных мерапрыемствах спартсмены асабліва запамінаюць тры рэчы. І гэта не спаборніцтвы. Памятаюць, ці якасна размясцілі, ці зручна перавезлі і як накармілі. Гэта топ-тры задачы, якія мы павінны выканаць на самым высокім узроўні, каб спартсмены змаглі выразыць сваю галоўную задачу — паказаць высокі спартыўны вынік», — падкрэсліў намеснік дырэктара фонду.

Ён таксама адзначыў, што сёння для дырэкцыі Еўрапейскіх гульняў пройдзе адзін з галоўных экзаменаў у плане адкрыцця ключавога аб'екта, дзе будуць праводзіцца спартыўныя мерапрыемствы, — стадыёна «Дынама».

«Менавіта там праз год пройдзе цырымонія адкрыцця і закрыцця гульняў. Днямі мы разам з Мінспорту, Нацыянальным алімпійскім камітэтам рыхтуем цікавае свята. Плануем арганізаваць відовішчны матч сярод найлепшых спартсменаў краіны. Тое, як пройдзе гэтае мерапрыемства, шмат у чым дасць нам разуменне, у якім кірунку рухацца ў падрыхтоўцы», — растлумачыў Анатоль Котаў.

Ён падзякаваў расійскім журналістам за вялікую цікавасць да Еўрапейскіх гульняў у Беларусі і адзначыў, што падобныя мерапрыемствы, у якіх удзельнічаюць вядучыя СМІ Расіі, ствараюць станоўчы імідж і краіны, і саміх спаборніцтваў.

«Мы неаднаразова падкрэслівалі, што найбольшую колькасць гасцей чакаем менавіта з Расійскай Федэрацыі, — рэзюмаваў Анатоль Котаў. Чым больш будзе інфармацыі пра наш праект, тым больш людзей прыедуць сюды або ўключаць тэлевізар у момант правядзення Еўрапейскіх гульняў».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**




## ■ Камунальныя стасункі

# СУБСІДЫІ НА НОВЫХ ПАДСТАВАХ «ЗАПРАЦУЮЦЬ» УЖО Ў ЖНІЎНІ

### А ў жыроўках іх убачаць спажыўцы паслуг ЖКГ толькі ў верасні

**Пра гэта паведаміў журналістам галоўны эканаміст упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алег ГРУЗІНАЎ.**

Нагадаем, у краіне Указам № 225, падпісаным 7 чэрвеня, пашырана сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый.

«Адпаведнае палажэнне ўказа ўступае ў сілу з 1 жніўня. Работа па выяўленні такіх грамадзян ужо вядзецца. Безнаяўныя жыллёвыя субсідыі будуць улічаныя ў іх паведамленнях восенню. У ліпені запланавана правядзенне семінараў для арганізацый, якія ажыццяўляюць налічэнне субсідый з улікам прынятых змяненняў», — сказаў галоўны эканаміст.

Названы ўказ пашырыў катэгорыі грамадзян, якія могуць атрымаць безнаяўныя субсідыі на аплату паслуг ЖКГ. Згодна з дакументам, права на субсідыю па выяўляльным прынцыпе мелі адзінокія і непрацуючыя пенсіянеры і інваліды. Цяпер права на субсідыю атрымалі яшчэ грамадзяне, якія даглядаюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў, інвалідаў І групы або старых 80 і больш гадоў, і якія атрымліваюць сацыяльныя дапамогі на гэтыя мэты. Прычым атрымальнікам не спатрэбіцца збіраць даведкі, кудысьці хадзіць — налічваецца і падаўжаецца субсідыя аднолькава. Усю інфармацыю ў АРІП падасць Мінпрацы і сацабароны са сваіх актуальных баз.

Права на атрыманне субсідый па заяўным прынцыпе дадзена грамадзянам або сем'ям, якія не маюць уласнага жылля і пражываюць у здымных кватэрах альбо ў інтэрнаце прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Для атрымання субсідыі па заяўным прынцыпе трэба звярнуцца ў мясцовыя органы ўлады, у ЖЭСы або разлікова-даведачныя цэнтры, дзе можна напісаць адпаведную заяву. Субсідыя выдзяляецца пры ўмове, калі штомесячная сума платы за жыллёва-камунальныя паслугі пры нарматыўным іх спажыванні перавышае 20 % сярэднямесячнага сукупнага даходу сям'і ў гарадзе і 15 % у сельскай мясцовасці.

**Сяргей КУРКАЧ**

## Раналду абыграў і Марока

FIFA WORLD CUP RUSSIA 2018

Чэмпіёны Еўропы партугальцы ў групе В атрымалі першую перамогу на чэмпіянаце свету — з лікам 1:0 яны абыгралі каманду Марока. Гол у пачатку матча забіў, ну, зразумела ж, Крышціяну Раналду, і гэта быў яго 85-ы мяч за зборную. Потым еўрапейцы ўдавольна эканомілі сілы і не вельмі актыўнічалі ў жаданні забіць яшчэ, хоць у таго ж Раналду і яго калег былі шанцы. Мараканцы ж мелі некалькі магчымасцяў, але іх падводзілі то нежаданне дзяліцца мячом з партнёрамі, то грубасць, то выканальніцкае майстэрства. У выніку зборная Марока стала яшчэ адной камандай пасля Саудаўскай Аравіі, якой на чэмпіянаце засталося згуляць толькі адзін матч. А ў сеціве жартуюць, што з камандай Партугаліі змагацца можна, а вось з Раналду — не.



## Гуляй, Расія!

Свята на вуліцы гаспадароў чэмпіянату свету даволі эфектна працягнулася — у другім матчы групавога турніру ў групе А ў аўторак увечары каманда Расіі з лікам 3:1 перамагла зборную Егіпта.

8:1 — такая розніца мячоў расіян за першыя гульні і дзве перамогі амаль забяспечылі гаспадарам турніру выхад у 1/8 фіналу. Перашкодзіць ім гэта зрабіць можа толькі каманда Саудаўскай Аравіі, калі атрымае перамогі над Уругваем і Егіптам, але такі варыянт хіба з вобласці фантастыкі. І балельшчыкі, і футбольныя спецыялісты з розных краін мяркуюць (і нават просяць прабачэння за негатыўныя каментарыі), што з камандай Расіі нешта здарылася, бо менавіта такой яскравай гульні ад яе ніхто не чакаў.

Тым не менш гэта толькі хоць і нечаканая, але цудоўная прычына для агульнай радасці для ўсіх расіян, што яны і робяць — гуляе амаль уся краіна, а не толькі гарады, дзе праходзяць матчы. Праўда, у 1/8 фіналу каманду Расіі будуць чакаць Партугалія або Іспанія, але пакуль на вуліцы гаспадароў чэмпіянату свету вялікае свята, якое яны сапраўды заслужылі сваёй гульнёй.

**Іван КУПАРВАС.**


Фота rsport.ria.ru.

# ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Беларусь і Літва дамаўляюцца аб супрацоўніцтве ў сацзабеспячэнні

**У Вільнюсе адбыўся другі раўнд кансультацый беларускіх і літоўскіх экспертаў у галіне сацыяльнага забеспячэння. На ім былі ўзгоднены рашэнні па размеркаванні абавязацельстваў дзяржаў па прызначэнні і выплаце пенсій, а таксама страхавых выплат у сувязі з няшчаснымі выпадкамі на вытворчасці.**

У прыватнасці, Беларусь і Літва дамовіліся аб прапарцыйным прынцыпе ўзаемнага пенсійнага забеспячэння. Такі прынцып прадугледжвае назначэнне і выплату пенсій дзяржавай, на тэрыторыі якога быў набыты стаж, у тым ліку ў перыяд СССР. Таксама была дасягнута дамоўленасць аб палажэннях, якія датычацца перагляду пенсій, прызначаных да ўступлення ў сілу дагавора, па заяве асобы.

У найбліжэйшай будучыні эксперты таксама прапрацуюць пытанні па экспарце дапамог, аказанні медыцынскай дапамогі грамадзянам, якія пражываюць на тэрыторыях нашых краін, абмену інфармацыяй аб палажэннях заканадаўства і іншыя.

**Святлана БУСЬКО.**

## Прызначаны дадатковы цягнік Мінск—Львоў

**У мэтах забеспячэння перавозкі пасажыраў у перыяд ліпеньскіх свят Беларуская чыгунка па ўзгадненні з украінскім бокам прызначыла дадатковыя цягнікі № 451/462 і № 461/462 Мінск—Львоў—Мінск (праз Баранавічы-Палескія, Лунінец, Удрыцк, Сарны, Роўна, Здалбунаў).**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, цягнік № 451 з Мінска адправіцца 29 чэрвеня ў 17.38 і прыбудзе на станцыю Львоў 30 чэрвеня ў 5.32. Назад цягнік № 462 Львоў—Мінск (тым жа маршрутам) адправіцца з Львова 30 чэрвеня ў 6.57 і прыбудзе на станцыю Мінск-Пасажырскі ў гэты ж дзень у 21.22.

Цягнік № 461 Мінск—Львоў адправіцца са станцыі Мінск-Пасажырскі 1 ліпеня ў 17.38 і прыбудзе на станцыю Львоў 2 ліпеня ў 5.32.

У гэты ж дзень 2 ліпеня цягнік № 462 Львоў—Мінск (тым жа маршрутам) адправіцца са станцыі Львоў у 22.41 і прыбудзе на станцыю Мінск-Пасажырскі 3 ліпеня ў 22.41.

## Канфіскавалі пнеўматыку і нажы

**У Цэнтральнае РУУС сталіцы паступіла паведамленне ад грамадзяніна: праходзячы на рынку міма гандлёвай палаткі, ён убачыў, як невядомы прадае нажы і зброю.**

Праваахоўнікі спынілі незаконную рэалізацыю. У 28-гадовага мінчаніна было канфіскавана 17 газавых балончыкаў, пнеўматычныя вінтоўка і пісталет, а таксама 12 нажоў. Апошнія былі адпраўлены на экспертызу. Яе высновы: прадстаўленыя на даследаванне 10 нажоў выраблены заводскім спосабам і з'яўляюцца халоднай зброяй колюча-рэжучага дзеяння.

У дачыненні да прадаўца распачалі крымінальную справу за незаконныя дзеянні ў дачыненні да халоднай зброі. Малады чалавек можа атрымаць пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ або штрафу, або папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або арышту, або абмежаванне волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДАЧЫ І КАТЭДЖЫ: КАЛІ СКЛАДАНА ПРАДАЦЬ — ТО МОЖНА ЗДАЦЬ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Ніжэй за сабекошт

Распаўсюджанае меркаванне аб тым, што з надыходам цёплай пары верагоднасць прадаць сваю дачу ці катэдж істотна павялічваецца, а значыць можна і падняць цану, карэктуецца рэчаіснасцю. Пачынаючы з 2009 года цэны на загарадную нерухомасць паступова, але ўсё ж зніжаюцца.

— Якія-небудзь сярэднія цэны на дачы, катэджы і дамы, вывесці практычна немагчыма. Нават зыходзячы з іх плошчы або аддлегласці ад МКАД, — расказвае **начальнік аддзела «Дамы. Дачы. Катэджы» агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Алена АКУЛІЧ.** — У адрозненне ад кватэр у горадзе кожны з загарадных аб'ектаў значна больш унікальны і на яго кошт уплывае значна больш фактараў.

Узяць хоць бы месцазнаходжанне — розніца ў цане двух параўнальных па якасці, плошчы і аддлегласці ад МКАД аб'ектаў можа быць вельмі істотнай з-за напрамкаў, пад'язных шляхоў, транспартнай дасупнасці і асяроддзя.

Ці, напрыклад, праект дома — няхай колькасць паверхаў і плошча ў розных дамоў супадаюць, але ў кожным выпадку планіроўка свая. І ў нейкіх выпадках яна рацыянальная і зручная, а ў іншых уладальніку даводзіцца проста мірыцца з тым, што ёсць. Але, паколькі выбар аб'ектаў цяпер вялікі, пакупнік несумненна прыме рашэнне на карысць больш зручнага для яго. У такой сітуацыі ўласніку давядзецца альбо фарміраваць цану з улікам патрабаванняў рынку, альбо рабіць працэс продажу вечным, без якойнебудзь надзеі на рашэнне свайго пытання.

На думку Алены Акуліч, пры вызначэнні магчымага кошту загараднага аб'екта не працуе механізм «паглядзець, за якую цану іншыя выставілі» — у кожным канкрэтным выпадку яна можа быць як вышэйшая, так і ніжэйшая, чым заяўленая іншымі прадаўцамі. Акрамя таго, варта ўлічваць той факт, што ў продажы дастаткова аб'ектаў, якія па заяўленай цане ўжо не першы год шукаюць свайго пакупніка.

## Не сабе, дык людзям

Доўгі тэрмін экспазіцыі аб'ектаў на рынку абумоўлены бягучай яго кан'юнктурай. Ужо каторы год многія прадаўцы загараднай нерухомасці сутыкаюцца з тым, што прапанаваныя пакупнікамі цэны значна ніжэйшыя за сабекошт будаўніцтва падобнага новага аб'екта. Прычына гэтай сітуацыі ў тым, што крызісы 2000-х гадоў істотна знізілі пакупніцкую здольнасць нашых суайчыннікаў, а шырокі выбар падтрымлівае цэнавую канкурэнцыю паміж прадаўцамі.

Акрамя таго, некаторыя людзі сталі задавацца пытаннем, навошта ім укладваць вялікія грошы ў куплю загараднага аб'екта, а затым марнаваць сродкі на яго абслугоўванне і падтрыманне ў добрым стане, калі неабходнасць у ім толькі 3-4 месяцы на год? Значна прасцей на цёплыя месяцы зняць яго ў арэнду.

Наш эксперт раіць не спрачацца з рынкам, паколькі цэны на ім фарміруюцца аўтаномна, а пастарацца прыстасавацца да сітуацыі, якая склалася, і вырашыць пытанне максімальна выгадным для сябе спосабам. Ужо недастаткова проста падаць аб'яву аб продажы і чакаць званкоў. Трэба самім выходзіць на патэнцыйных пакупнікоў і ўжо пасля агляду весці дыялог аб цане. Як паказвае практыка, такі падыход дае добрыя вынікі — дзякуючы актыўнай рабоце з патэнцыйнымі пакупнікамі, каля 60 % такіх здзелак здзяйсняецца на працягу месяца.

Немалаважнае значэнне мае правільна вызначаная цана — пры яе фарміраванні варта арыентавацца не на прапанову, якая з'яўляецца толькі выказваннем жаданняў прадаўцоў, а на здзейсненыя здзелкі — менавіта яны ілюструюць рэальны парадак цэн. Ну, а калі бягучыя цэны здзелак зусім не задавальняюць, і па жаданай цане аб'ект доўга не прадаецца, то можна рабіць, як і іншыя прадаўцы — пакуль аб'ект знаходзіцца ў продажы, здаваць яго ў арэнду.

## Летні домік або самавітая «фазэнда»?

Каб даведацца, на што можна разлічваць уласнікам пры здачы ў арэнду дачы ці катэджа, а таксама даведацца пра запыты арандатараў, мы звярнуліся да **начальніка аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыты ПАЧЫЦКАЙ.**

— У залежнасці ад перыяду запатрабаванасці ў арэнду, дамы, дачы і катэджы ўмоўна можна падзяліць на дзве групы: аб'екты першай арандуюцца толькі ў цёплую пару года, а другой групы — для круглагадовага пражывання, як альтэрнатыва кватэры ў горадзе, — лічыць спецыяліст. — Як і ў выпадку з купляй-продажам, цана арэнды на загарадную нерухомасць залежыць ад шматлікіх фактараў. Мінімальны парог кошту можна акрэсліць у межах каля 200 рублёў у месяц, без уліку аплаты электраэнергіі.

**Прапанаваныя пакупнікамі цэны значна ніжэйшыя за сабекошт будаўніцтва падобнага новага аб'екта.**

Паколькі аб'ект арандуецца на ўсё лета, то за гэтыя грошы арандатары чакаюць убачыць як мінімум акуратны будынак, дзе можна сфарміраваць утульную абстаноўку і адпачыць. Гэта можа быць драўляная дача да 50 кіламетраў ад МКАД. Асаблівых выгод вынаходстваў не патрабуецца — дастаткова пячнога ацяплення, «выгоды» хутчэй за ўсё будуць на вуліцы, а гарачая вада ў лепшым выпадку з праточнага бойлера.

Цана арэнды будзе павялічвацца пры набліжэнні да Мінска і пры паляпшэнні якасці. Напрыклад, кошт арэнды капітальнай дачы (цаглянай, блокавай) у межах 40 кіламетровай зоны ад МКАД з усімі выгодамі (санвузел унутры дома, газ, інтэрнэт і ўчастак да 10 сотак) ужо можа дасягаць 600—800 рублёў у месяц. Ёсць катэгорыя арандатараў, хто замест адпачынку на моры аддае перавагу таму, каб на лета змяніць месцажыхарства. Імі запатрабаваныя камфартабельныя катэджы ў межах 20 кіламетраў ад МКАД: газіфікаваныя, з опавалаконным інтэрнэтам, кандыцыянерамі, магчыма, саўнамі і іншымі вынаходствамі цывілізацыі. Размяшчацца яны павінны не ў дачных кааператывах, а ў катэджных пасёлках. Важны камфорт пражывання і зручнасць пад'язных шляхоў, паколькі штодня арандатары будуць ездзіць на работу і назад. Цана арэнды падобных катэджаў можа пачынацца ад 1000 рублёў і дасягаць 2000 рублёў у месяц.

## Элітны загарадны дом

Маргарыта Пачыцкая ўпэўнена, што каб разлічваць на цану арэнды ў 2 000 рублёў і больш, неабходна, каб аб'ект адпавядаў самым высокім патрабаванням арандатараў, як па тэхнічным напаўненні, так і па месцазнаходжанні. Падобныя катэджы часцяком арандуюцца для кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў. Прыкладная плошча — 200—500 квадратных метраў.

Найбольш вялікія цэннікі здачы характэрныя для катэджаў у Драздах — прыкладна 5 000—10 000 рублёў у месяц. А, скажам, у Бараўлянах і Драздаве можна знайсці самавітыя аб'екты і за 3 000 рублёў у месяц. Падобныя катэджы прапануюцца і ў Мінску — у раёне Нацыянальнай бібліятэкі цана аб'ектаў знаходзіцца на ўзроўні 3 000—6 000 рублёў у месяц, трохі танней у Заслаўі. Але зноў жа — усё залежыць ад катэджа і яго якасці.

Эксперты лічаць, што прадаць загарадны дом, дачу ці катэдж цалкам рэальна і за месяц. Для гэтага трэба проста актыўна прапаноўваць свой тавар на рынку і арыентавацца на цэны здзелак. А калі ж ісці на саступкі адносна кошту няма магчымасці або жадання, то можна паралельна пошуку пакупнікоў, атрымліваць ад аб'екта рэнтны даход. Тут важна ўважліва выбіраць арандатараў і правільна складаць дагавор арэнды.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### Куплю вэб-сайт, нядорага...

**Нацыянальным кадастравым агенцтвам упершыню ацэнены аб'екты інтэлектуальнай уласнасці**

**Яго супрацоўнікамі была праведзена ацэнка рэшткавага і рынкавага кошту інтэрнэт-сайтаў (вэб-сайтаў), якія належаць буйному беларускаму аператару і распрацоўшчыку РУП «Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн». Аб гэтым паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.**

Атрыманыя вынікі і вопыт з'яўляюцца ўнікальнымі, як адзначаюць у агенцтве, паколькі ацэнка рынкавага кошту камерцыялізаваных аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці ў цяперашні час для нашай краіны па-ранейшаму з'ява досыць рэдкая. Аднак разам з ростам значэння такіх аб'ектаў паралельна пачынае ўзрастаць і попыт на гэты від паслуг.

Напрыклад, асаблівасць інтэрнэт-сайта — тое, што ён уяўляе сабой складаны твор і з'яўляецца аб'ектам аўтарскага права. У яго могуць уключацца такія аб'екты аўтарскага права, як: камп'ютарная праграма, якая забяспечвае функцыянаванне вэб-сайта; дызайн вэб-сайта; іншыя аб'екты аўтарскіх правоў (базы даных, геаграфічныя карты, тэставыя творы і іншыя).

Акрамя таго, у вэб-сайт могуць уключацца і іншыя аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, напрыклад таварны знак або знак абслугоўвання.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### За суткі ліквідавана 11 пажараў у экасістэмах

**Так, увечары ратавальнікам паступіла паведамленне аб загаранні тарфянога поля каля вёскі Хамічы Зэльвенскага раёна. Калі да месца выкліку прыбыло першае падраздзяленне МНС, у пойме ракі Зальвянкі асобнымі ачагамі гарэла тарфяное поле на агульнай плошчы 0,2 гектара, глыбінёй залягання торфу да 30 сантыметраў. Быў абвешчаны збор асабовага складу раённага падраздзялення МНС.**

На месцы працавала тэхніка ратавальнікаў, пагрузчык, трактар сельскагаспадарчага прадпрыемства, на тэрыторыі якога адбыўся пажар, а таксама добраахвотная пажарная дружына. Пажар быў лакалізаваны работнікамі МНС у 19.45. Па стане на раніцу 20 чэрвеня заставалася ліквідаваць 0,02 гектара палаючага торфу. Пагрозы здароўю людзей і парушэння экасістэмы няма. Прычына пажару высвятляецца.

Ратавальнікі нагадваюць, што забарона на наведванне лясоў уведзена ў большасці рэгіёнаў краіны. Паводле аператыўных даных Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, толькі за суткі ліквідавана тры лясныя пажары на агульнай плошчы 9,3 гектара і восем пажараў травы і кустоў на агульнай плошчы 7,5 гектара.

### Падземка — на летні рэжым

**З 25 чэрвеня Мінскі метрапалітэн у ранішні і вячэрні гадзіны пік крыху павялічыць інтэрвалы руху.**

Падземка будзе адкрытая для пасажыраў з 5.30 да 0.40, нязначна зменіцца графік руху. На першай лініі яго інтэрвал у ранішні і вячэрні гадзіны пік (з 7.00 да 9.00 і з 17.00 да 19.00) з 2 хвілін павялічыцца да 2,5 хвіліны. На другой лініі інтэрвал руху ў ранішні час пік будзе складаць 3 хвіліны, а ў вячэрні — 3,5 хвіліны. Пры гэтым у пятніцу пікавы вячэрні час пік крыху перасунецца — на перыяд з 16.00 да 18.30. З летнім графікам больш падрабязна можна азнаёміцца на сайце метрапалітэна.

Апроч таго, унесены карэктывы ў рэжым работы 21 чэрвеня — дзень адкрыцця пасля рэканструкцыі стадыёна «Дынама». З 17.00 да 23.00 цягнікі будуць хадзіць з інтэрвалам у 2 хвіліны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Мясная кантрабанда не прайшла

**Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік Брэсцкай пагранічнай групы Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ, спынена спроба незаконнага перамяшчэння праз граніцу буйной партыі ялавічыны.**

Брэсцкія вартавыя мяжы заўважылі падазроныя аўтамабілі, якія рухаліся ў Маларыцкім раёне ў памежнай паласе. У адказ на патрабаванне супрацоўнікаў пагранічнай службы спыніцца кіроўцы, наадварот, прыбавілі газу. Вайскоўцам давялося прымяніць зброю. Пасля гэтага тры транспартныя сродкі былі затрыманыя. У салонах і багажніках машын аказалася 44 тушы буйной рагатай жывёлы. Жыхары Маларыцкага раёна спрабавалі ўвезці тавар з Украіны ў Беларусь у абход пунктаў пропуску. Зразумела, што гэтая прадукцыя не прайшла ветэрынарнага і санітарнага кантролю.

Цяпер парушальнікам давядзецца адказваць у адпаведнасці з законам. Ім пагражаюць даволі буйныя штрафы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

21 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15843)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

Тэа і Вольга РЫЖЫКАВА:

# «МЫ ЗНАЁМЫЯ ЎСЁ ЖЫЦЦЁ»



**Яны, напэўна, адна з самых яркіх пар беларускага тэлебачання. Сёння Вольга Рыжыкава і Тэа будзяць сваім аптымізмам і добрым настроем усю краіну ў эфіры праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!» на тэлеканале «Беларусь 1», разам спяваюць і здымаюць сумесныя кліпы. Пра тое, хто галоўны ў сям'і, сумесны адпачынак і рэўнасць з-за паклоннікаў і паклонніц артысты расказалі «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Ці дапамагае ў працы, што вы разам не толькі на экране, але і ў жыцці?***

**Тэа:** — У тым, што менавіта сямейная пара знаходзіцца ў прамым эфіры праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!», ёсць правільны канэкт з аўдыторыяй — сем'ямі, якія пачынаюць свой дзень разам з намі. Таму мы часам дазваляем сабе жарты сямейнага характару, прапускаем нейкія сітуацыі праз уласны досвед. Дарэчы, мы сапраўды разумеем адно аднаго з паўслова.

**Вольга:** — А я дадам, што нам прасцей, у параўнанні з іншымі вядучымі, у плане абмеркавання страў, сцэнарыяў: мы можам рабіць гэта дома.

**Тэа:** — У рэшце рэшт, у Волі не ўзнікае пытанняў, куды так рана ідзе яе муж. *(Смяецца.)*

***— А ці цяжка прачынацца рана?***

**Тэа:** — Шчыра кажучы, калі б мы былі вядучымі праграмы «Добры вечар, Беларусь!», гэта было б больш зручна. У нашай сям'і першай прачынаецца Воля, а ў мяне з гэтым праблемы. І калі б не яна, я б некалькі эфіраў праспаў дакладна.

**Вольга:** — Прывыкнуць да такога графіка — ранняга эфіру праграмы — складана да гэтага часу, бо ёсць яшчэ і іншыя занятк. Калі б мы працавалі толькі ў «Добрай раніцы, Беларусь!», тады, вядома, можна было б прыстасавацца і засынаць, напрыклад, у 8-9 гадзін вечара. Таму і для мяне, і для Юры гэта заўсёды экстрэмальны пад'ём.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

*Абітурыент–2018*

# ПРАФЕСІЯ НЕ ДЛЯ КОЖНАГА

## Ад педагога залежыць, як «будзе гучаць мелодыя»

**Медыяпраект «Мая малая Радзіма, або Чаму я стаў педагогам?» запусцілі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Яго вынікам павінен стаць шматсерыйны фільм, прысвечаны знакавым асобам БДПУ. Мяркуецца, што кожная серыя будзе прысвечана малой радзіме героя сюжэта і яго педагагічнаму шляху. Трэба адзначыць, што гэта далёка не першы праект ва ўніверсітэце, у цэнтры якога аказваецца асоба педагога. Раней праводзіўся творчы конкурс на найлепшае сачыненне пра настаўніка сярод школьнікаў і студэнтаў, конкурс відэаролікаў аб прафесіі настаўніка, ладзіліся дэбаты па педагагічнай футуралогіі «Школа заўтрашняга дня», фарсайт-форум «Будучыя педагогі — пра тэхналогіі будучыні»... Напярэдадні прыёмнай кампаніі мы сустрэліся з рэктарам, прафесарам Аляксандрам ЖУКОМ, каб даведацца, каго будуць рады бачыць у педагагічным універсітэце...**

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***



Аляксандр Жук уручае педагагічны «Оскар» (статуэтку, якая ўяўляе сабой мініяцюрную копію скульптурнай кампазіцыі «Настаўніца першая мая») пераможцы конкурсу «Студэнт года» ў намінацыі «Навукова-даследчая дзейнасць» трэцякурсніцы спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура» Алене Фендзіч.

*У ліку найлепшых*

# ПРАПУСЦІЦЬ УСЁ ПРАЗ СЯБЕ,

## ці Прафесіі патрэбны нераўнадушныя

**У сённяшнім выпуску «Чырвонкі. Чырвонай змены» мы, як і абяцалі, назавём імёны пераможцаў нашага традыцыйнага творчага конкурсу для юных і маладых няштатных аўтараў «Я — малады. І мне — не ўсё роўна!» Імі па выніках сезона 2017—2018 гадоў рэдакцыйнае журы прызнала... Але перш чым агучыць імёны найлепшых удзельнікаў творчага спаборніцтва, хацелася б сказаць колькі слоў пра наступнае.**

Штогод, традыцыйна ў красавіку — маі, у рэдакцыю пачынаюць паступаць шматлікія электронныя звароты ад выпускнікоў прыкладна аднаго зместу. «Я абітурыент журфака, буду сёлета паступаць, патрэбны публікацыі», «дайце заданне, гатовы выканаць любое», «хачу з вамі супрацоўнічаць», «магу пісаць у любым жанры». Класіка таго самага «жанру» — «збіраюся асвойваць рэчышча журналісткі»... Электронныя допісы, як правіла, на рускай мове, у якасці звестак пра патэнцыйнага аўтара — у лепшым выпадку толькі адно імя (ні прозвішча, ні нумара школы, ні кантактнага нумара тэлефона), электронны адрас — «дзіцячы», накшталт памяншальна-ласкальнага імя, напісаўшы на які, не можна так і не дачакацца адказу, або ён прыйдзе праз некалькі тыдняў...

Усё гэта сведчыць пра тое, што такія абітурыенты ў прамым сэнсе слоў ачомаліся ў апошні момант, вырашыўшы паступаць на журфак. Заўважце, яны пішуць з адной мэтай — «патрэбны публікацыі»: не азы ведаў, не парады прафесійных журналістаў, не практыка, каб «набіць руку». Што ж, і так бывае — нехта сапраўды здолее атрымаць тыя самыя публікацыі і паступіць.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Пераможцы конкурсу сезона 2017/2018** *(злева направа)*: **Паліна Пракапеня, Анастасія Ярахновіч і Надзея Бобрык.**

Толькі ці не прыйдзе пазней пасля такога відавочна спантаннага рашэння расчараванне ў выбранай прафесіі? Абітурыент жа бачыць найперш яе знешні прыгожы бок: знаходжанне з мікрафонам у кадры, прозвішча пад артыкулам на першай паласе... Насамрэч «журналіцкі хлеб» часта мае саленаваты прысмак...

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

# ПРАФЕСІЯ НЕ ДЛЯ КОЖНАГА

## Першы блін не камяком

— У наступным годзе БДПУ адзначыць свой 105-гадовы юбілей, і мы ўжо распачалі падрыхтоўку да яго: запускаем конкурс «БДПУ — мая малая радзіма». Накіравалі ўсім нашым вядомым выпускнікам, сярод якіх ёсць і парламентарыі, і кіраўнікі навуковых прадпрыемстваў, акадэмікі, прадстаўнікі найвышэйшага менеджменту ў адукацыі, прапанову-просьбу падзяліцца сваімі думкамі наконт таго, якую ролю адыграў педагагічны ўніверсітэт у іх прафесійным станаўленні і развіцці як асобы, расказаць пра найбольш яркія падзеі з іх студэнцкага жыцця. Усе матэрыялы будуць сабраныя ў альманах «БДПУ — мая малая радзіма», і кожны з аўтараў абавязкова атрымае экзэмпляр юбілейнага выдання.

***— Аляксандр Іванавіч, не памылюся, калі скажу, што абсалютна кожная ВНУ нацэлена на прыцягненне найбольш моцных і матываваных абітурыентаў. Але ў вас ёсць свая спецыфіка...***

— Усе мы добра разумеем: ад таго, які абітурыент прыйдзе сёння вучыцца да нас, залежыць, які настаўнік прыйдзе заўтра ва ўстановы адукацыі. Але як матэматык я вам скажу так: моцная падрыхтоўка — неабходная ўмова, але недастатковая. Педагогіка — прафесія не для кожнага. Нам патрэбныя маладыя людзі з педагагічнымі схільнасцямі, з жаданнем вучыць іншых, з лідарскімі якасцямі, уменнем камунікаваць і выстройваць стасункі з іншымі. Гэта не праца на канвееры, а штодзённая работа з людзьмі: вучнямі і іх бацькамі. Матывацыя да прафесіі — вось што, напэўна, самае важнае. Дзеці — розныя, а задача настаўніка — зразумець усіх, да кожнага вучня знайсці свой ключык.

***— Некалькі гадоў таму вы зрабілі стаўку на развіццё сеткі педагагічных класаў. Летась адбыўся першы масавы выпуск. Ці засталіся задаволеныя якасцю падрыхтоўкі першакурснікаў, якія паступілі да вас па выніках гутаркі?***

— Наша ідэя стварэння педкласаў была падтрымана на самым высокім узроўні і сёння мы бачым, што гэта было правільнае рашэнне. У бягучым навучальным годзе на першым курсе ў нас навучаюцца 130 выпускнікоў педкласаў, і мы ўважліва сочым за імі: хто ж да нас прыйшоў, ці не было гэта памылкай? Пры паступленні ва ўніверсітэт іх сярэдні бал быў каля дзевяці — гэта вельмі высокі паказчык. Падчас першай зімовай сесіі, калі сярэдні бал першакурснікаў па ўніверсітэце быў недзе каля сямі балаў, у выпускнікоў педкласаў ён быў каля васьмі — як і ў медалістаў, якія таксама паступаюць ва ўніверсітэт без экзаменаў. Значыць, па падрыхтоўцы яны ім не саступаюць.

Што нас вельмі радуе, дык гэта сацыяльная актыўнасць выхаванцаў педкласаў, іх лідарскія якасці, гатоўнасць браць на сябе адказнасць. Яны задзейнічаны ва ўсіх нашых найважнейшых мерапрыемствах і праектах: далучаюцца да прафсаюзных спраў, валанцёрскага руху, працуюць у студатрадах, удзельнічаюць у творчым і спартыўным жыцці ўніверсітэта. Сярод іх

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Традыцыйна кожную вясну ў БДПУ праходзіць Дзень адкрытых дзвярэй.

13 старастаў толькі на першым курсе. А студэнты Інстытута інклюзіўнай адукацыі стварылі ва ўніверсітэце клуб выпускнікоў педагагічных класаў. У іх ёсць агульная платформа, што аб'ядноўвае, яны пачынаюць групавацца ў своеасаблівае братэрства, чаму мы вельмі рады.

Таксама ў нас праводзілася ананімнае анкетаванне выпускнікоў педкласаў, якія сталі нашымі студэнтамі, з мэтай даведацца, як яны самі ацэньваюць вынікі сваёй першай сесіі, ці апраўдаліся іх чаканні ад вучобы ва ўніверсітэце, ці не расчараваліся яны ў выбары? Першакурснікі канстатавалі, што сесія была для іх няпростая. Калі на гуманітарных факультэтах сярэдні бал быў 9, то на фізіка-матэматычным — каля 7. На іх думку, яны яшчэ не зусім адаптаваліся да ўніверсітэцкіх патрабаванняў, не былі гатовыя да таго, што ў вышэйшай школе трэба сістэматычна працаваць, але яны сталі больш вопытныя, таму ўпэўнены ў тым, што другая сесія будзе для іх больш паспяховай. Мы таксама з нецярплівасцю чакаем вынікаў летняй сесіі... А на пытанне: «Калі б у вас была магчымасць зноў паступаць ва ўніверсітэт, ці выбралі б вы БДПУ?» абсалютная большасць дала станоўчы адказ.

## Першы досвед

***— Вам не крыўдна, калі льготу для медалістаў пры паступленні ў ваш універсітэт называюць «прылазам для лянівых»? Маўляў, яны нават ЦТ на прыстойны бал здаць не могуць...***

— Тут я з вамі паспрачаюся: «медаліст» і «лянівы» — гэта паняцці з розных сістэм каардынат! Каб вучыцца на выдатна па ўсіх прадметах, патрабуюцца не толькі акадэмічныя здольнасці, але і такія якасці характару, як сіла волі, мэтанакіраванасць, працавітасць, вынослівасць, уменне размяркоўваць нагрузку, высокая ступень адказнасці і іншыя. Летась у БДПУ былі залічаны 175 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў ССНУ з адзнакай. З кожным годам усё большая колькасць медалістаў выбірае БДПУ! Заўважу, што з 32 спецыяльнасцяў дзённай формы навучання выдатнікі могуць паступаць без экзаменаў толькі на 12. На найбольш запатрабаваныя абітурыентамі спецыяльнасці накшталт «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка», «Руская мова і літаратура. Замежная мова» такой льготы няма. Але калі паглядзець на спісы першакурснікаў, то на кожную з гэтых спецыяльнасцяў залічаны медалісты. Гэта значыць, што ўсе яны паспяхова здалі цэнтралізаванае тэсціраванне і ўдзельнічалі ў конкурсе на агульных падставах.

***— У красавіку — маі сёлета праводзілася анкетаванне сярод выпускнікоў педагагічных класаў. Ці можаце вы падзяліцца яго вынікамі?***

— Каб мець зваротную сувязь (наколькі навучэнцы педагагічных класаў задаволены праграмай факультатыву «Уводзіны ў педагагічную прафесію», якія рэкамендацыі яны фармулююць і г. д.), Цэнтр развіцця педагагічнай адукацыі заўсёды маніторыць сітуацыю. Больш за палову выпускнікоў педкласаў гэтага года (56 %) адзначылі, што ім спадабалася навучацца ў педагагічным класе, 42 % не шкадуюць аб тым, што прайшлі такую профільную падрыхтоўку. І каля 80 % выпускнікоў лічаць факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічную прафесію» карыснымі для развіцця асобы ўвогуле. Вось што кажуць яны самі. *«Дзякуючы гэтым заняткам я стаў больш упэўненым». «Асабліва каштоўнымі для мяне былі веды і ўменні ў галіне кіравання канфліктамі і міжасобавага ўзаемадзеяння. Упэўнены, што гэтыя тэмы спатрэбяцца ў маёй будучай прафесійнай дзейнасці». «Педагагічныя спробы былі новым і цяжкім для мяне досведам. Не думала, што настаўнік павінен так шмат зрабіць, каб правесці ўрок». «Педагагічны клас — ідэальная знаходка для навучэнцаў, якія мараць аб паступленні ў педагагічны ўніверсітэт».*

***— На гутарцы выпускнікі педагагічных класаў прадстаўляюць сваё партфоліа «Я — педагог». Скажыце, гэта фармальнасць ці першыя педагагічныя спробы школьнікаў насамрэч вартыя ўвагі? Увогуле, ці варта баяцца гутаркі?***

— Партфоліа — вынік двухгадовай працы вучня. Спачатку мы прапанавалі комплекснае партфоліа, якое складалася з трох раздзелаў: «Мой партрэт», «Асабістыя дасягненні» і «Партфоліа работ». Потым прапанавалі ўключыць у яго структуру рэфлексіўны раздзел, у які можна змяшчаць рэфлексіўныя і ацэначныя каментарыі педагогаў, аднакласнікаў, бацькоў, вынікі рэфлексіі і самааццэнкі самога навучэнца.

На гутарках, якія праходзілі летась, у нас была магчымасць пазнаёміцца са створанымі партфоліа, і мы пераканаліся ў тым, што работа над імі дапамагае адрэфлексаваць сваю педагагічную дзейнасць, правесці самадыягностыку ўласных педагагічных здольнасцяў і зрабіць усвядомлены выбар прафесіі. Хлопцы і дзяўчаты адзначалі, што работа па якасным напаўненні партфоліа была не з простых, але гэта быў вельмі карысны досвед і важнае асабістае дасягненне. Таму я раю ўсім нашым абітурыентам: **не трэба саромецца дэманстраваць свае дасягненні! Баяцца гутаркі таксама не варта.** Але трэба быць гатовым растлумачыць, чаму вы выбіраеце дадзеную педагагічную спецыяльнасць, прадэманстраваць валоданне паняццямі, засвоенымі на факультатыўных занятках, і падмацаваць усё ўласнымі педагагічнымі спробамі. На сайце «Педагагічныя класы» https://pedklassy.bspu.by/ у раздзеле «Пытанні, што часта задаюць» можна прачытаць пра тое, як праходзіць гутарка і якія дзейнічаюць крытэрыі ацэньвання яе вынікаў.

Мы ўжо задумваемся над тым, каб стварыць своеасаблівую галерэю з самых цікавых партфоліа, каб з імі маглі азнаёміцца цяперашнія навучэнцы педкласаў. Але для гэтага нам спатрэбіцца дазвол іх аўтараў. Спадзяюся, што яны нашу ідэю падтрымаюць.

Увогуле падчас гутаркі стала зразумела, што да нас прыйшла асаблівая катэгорыя абітурыентаў. Яны не толькі ведаюць спецыфіку педагагічнай працы, яе плюсы і мінусы, але ўжо маюць і першы педагагічны досвед, таму разглядаюць пытанні адначасова і з пазіцыі настаўніка, і з пазіцыі вучня, умеюць весці дыялог, аргументаваць сваю думку.

Хочацца падзякаваць і кіраўнікам школ, што яны вельмі адказна ставяцца да выдачы рэкамендацый. Далёка не кожны выпускнік можа разлічваць на гэты дакумент, а толькі самыя дастойныя.



У міжвузаўскім конкурсе грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева Вясна Беларусі — 2018» студэнтка факультэта дашкольнай адукацыі Кацярына Дзябёлая стала пераможцай у намінацыі «Абаянне». На сцэне яна «намалявала» партрэт вядомага рэжысёра Леаніда Гайдая ў тэхніцы «зорны пыл».

## На крок наперадзе

***— Ці падзяляеце вы наступную думку: імідж настаўніка залежыць ад таго, наколькі ён адпавядае патрэбам часу?***

— Сучасны настаўнік павінен быць гнуткім, мабільным, таму што з кожным годам рытм нашага жыцця паскараецца, паток інфармацыі расце... Калі бацькі кажуць, што адзін педагог — добры, а другі — дрэнны, думаю, што кожны з іх мае на ўвазе штосьці сваё. Для кагосьці ідэальны настаўнік — той, хто добра ведае свой прадмет, для іншага — той, хто любіць дзяцей. Некаму хочацца, каб настаўнік быў строгім і патрабавальным.

Быць настаўнікам сёння няпроста. Інтэрнэт па сіле ўплыву на маладых людзей істотна перасягае магчымасці сучаснага настаўніка, а падручнік перастаў быць галоўным сродкам навучання. Таму настаўнік не можа быць проста транслятарам ведаў, ён павінен быць кансультантам, памочнікам, сябрам дзяцей. Яго задача — даць аснову, абудзіць цікавасць да свайго прадмета і навучання ўвогуле, навучыць вучня самастойна здабываць веды, аналізаваць і, магчыма, самае важнае, — сфарміраваць стрыжань асобы дзіцяці. Настаўнік XXI стагоддзя — гэта цікавы, харызматычны, адукаваны чалавек, нераўнадушны, поўны творчай энергіі, які выхоўвае такіх жа актыўных, неабыякавых і мыслячых людзей. Пра IT-кампетэнцыі я нават не кажу — з дзецьмі трэба размаўляць на адной мове... Настаўнік павінен не проста ісці ў нагу з часам, а быць на крок наперадзе.

Дарэчы, у факультатыве «Уводзіны ў педагагічную прафесію» іміджу настаўніка прысвечаны асобны раздзел. І, па словах вучняў профільных педагагічных класаў, гэтая тэма для іх адна з самых цікавых.

**«Педагагічныя спробы былі новым і цяжкім для мяне досведам. Не думала, што настаўнік павінен так шмат зрабіць, каб правесці ўрок».**

***— Любы выбар зрабіць складана, а тым больш выбар прафесіі. На якія пытанні павінен шчыра адказаць сам сабе выпускнік, які задумваецца аб прафесіі педагога?***

— Быць настаўнікам — адна з найскладанейшых задач, таму што адзін чалавек павінен быць адначасова псіхолагам, прамоўцам, акцёрам, арганізатарам, выдатным імправізатарам. Сутнасць прафесіі педагога не проста ў трансляцыі ведаў. Гэта высокая місія і гатоўнасць вучыцца ўсё жыццё разам з дзецьмі і ў дзяцей. Адна з вучаніц напісала пра педагога ў сваім сачыненні: **«...Гэта музыкант, які віртуозна грае на тонкіх струнах дзіцячай душы. І ад майстэрства педагога-музыканта залежыць, як будзе гучаць мелодыя».** Зрабіць з чалавека добрага настаўніка можа толькі неабыякавасць: калі ў цябе ёсць імкненне змяніць свет да лепшага, то гэтая прафесія для цябе!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Поўны тэкст інтэрв'ю шукайце на сайце zviazda.by**

*Свой шлях*

# ДА МАРЫ — ПРАЗ САМАРАЗВІЦЦЁ



**...Хлопчык з прыгожага мястэчка Акцябрскі на Гомельшчыне, ці гістарычнай Рудабелкі, як прывыклі называць пасёлак мясцовыя жыхары, не марыць пра крутое аўто альбо дарагі касцюм, не глядзіць вядомых ююьюб-блогераў, не сядзіць суткамі ў сацыяльных сетках. Марнаваць час — не ў традыцыях Даніла.**
**На сёння ў скарбонцы хлопца шмат узнагарод і падзяк, сярод якіх — дыплом трэцяй ступені конкурсу «Юны прамоўца» на міжнароднай алімпіядзе па рускай мове, дыплом першай ступені рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару па беларускай мове, дыплом трэцяй ступені трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па рускай мове і літаратуры.**
**А яшчэ на працягу некалькіх гадоў ён станавіўся дыпламантам абласных конкурсаў «Ведай і любі рускую мову», «Гавары са мной па-беларуску». Чым захапляецца юнак, якія дасягненні і жаданні носіць у «кішэні», што хоча змяніць у гэтым свеце? Пра гэта я спытала ў Данііла ШЭЙКА, выпускніка Акцябрскай раённай гімназіі.**

**— Нішто сабе, Данік, адкуль столькі дыпломаў?**

— Усё пачалося з піянерскай дзейнасці. У сёмым класе я хацеў як мага больш працаваць. Не рукамі, а розумам, быць карысным паўсюль. Дзеля гэтага здымаў відэаролікі на экалагічную і сацыяльную тэматыку. Акрамя таго, штурмаваў рэспубліканскі ўзровень са сваімі навуковымі праектамі. Гэта ўсё зацягнула, захапіла. У восьмым класе звярнуў увагу на журналістыку, пачаў пісаць у розныя газеты, аналізаваць тэлеперадачы беларускіх каналаў. Асвойваючы некаторыя тонкасці прафесіі, зразумеў, што ў гэтай сферы трэба не толькі ўмець нешта пісаць, але і многа ведаць, каб пры падрыхтоўцы публіцыстычных матэрыялаў адчувалася глыбіня думкі. Не хацеў спыняцца, таму пачаў актыўна ўдзельнічаць у алімпіядах па рускай і беларускай мовах, выступаў на канферэнцыях, конкурсах, стаў удзельнікам раённай зборнай каманды КВЗ.

**— А чым цікавішся акрамя журналістыкі і непасрэдна вучобы?**

— Мне падабаецца займацца навуковай дзейнасцю. Яшчэ самастойна вывучаю беларускую і рускую мовы, гісторыю, культурныя традыцыі нашай краіны і замежных, мінулае краю. Лічу, што менавіта даследаванне і вывучэнне свайго, беларускага, з'яўляецца крыніцай сілы і натхнення для чалавека. Заўсёды памятаю: дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся. Калі адарвешся ад каранёў, пакінеш родны дом — гэтай крыніцы не стане.

**— Што для цябе значаць словы «любіць Беларусь»?**

— Перш за ўсё — адказнасць. Напрыклад, ідзеш на рэчку, бачыш смецце — падбяры. Некаторыя людзі не адчуваюць адказнасці перад прыродай, ствараюць прыгажосць толькі вакол сябе. Каб добра жыць у будучыні, трэба памятаць пра мінулае і рабіць наш свет лепшым цяпер. Часам мы зайздросцім прыгажосці ў іншых краінах, але не бачым таго, што побач з намі. А між тым у нас прырода не горшая.

**— Што дае табе сілы не спыніцца на дасягнутым і крочыць далей, скараць новыя вяршыні?**

— Вельмі важнае самаразвіццё. Ніхто не зробіць за цябе работу. Усё тое, за што бярэшся, патрабуе дэталёвага разбору. Я шмат чытаю, размаўляю з рознымі людзьмі, гляджу дзясяткі фільмаў на пэўную тэму, толькі тады магу штосьці зразумець. Са мною заўсёды сумненні і патрабавальнасць да сябе і іншых. Калі не зраблю штосьці ідэальна — не супакоюся.

Хачу параіць: чытайце добрую літаратуру, глядзіце карысныя фільмы. Я вельмі люблю Караткевіча. Чытаецца лёгка, і ўражанні пасля застаюцца на доўгі час. Яго творы — гэта штосьці нязведанае, загадкавае. Раскрываецца стаўленне чалавека да блізкіх, да жыцця, да сябе. Можна знайсці адказы на пытанні, якія хвалююць. Яго творы я магу параўнаць з беларусамі: нешта знешне простае, але вельмі глыбокае.

**— З чым хочаш звязаць свой лёс?**

— Хачу паступіць на аўдыявізуальную журналістыку ў БДУ. Каб усё атрымалася, рыхтую публікацыі (але я не пішу дзеля таго, каб проста было «ў скарбонцы», раблю гэта свядома), аналізую тэлепраграмы, вывучаю дзейнасць журналістаў (падабаюцца Ганна Залатკоўская, Уладзімір Познер, Віктар Корбут). Акрамя таго, у мяне ў марах рэалізаваць на журфаку некалькі праектаў, звязаных з распаўсюджваннем беларускай мовы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка III курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

# ПРАПУСЦІЦЬ УСЁ ПРАЗ СЯБЕ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)***

Гэта ўжо бясспрэчна ведаюць удзельнікі конкурсу. Па-першае, многія з іх дасылалі свае «пробы пяра» на наша творчае спаборніцтва не першы раз. Па-другое, амаль усе яны праявілі цікавасць да прафесіі журналіста год-два-тры таму. Па-трэцяе, падмацоўваючы і развіваючы яе, запісаліся і наведваюць гурткі журналістыкі або падрыхтоўчыя курсы для паступлення. Канешне, не ўсё заўсёды атрымліваецца гладка і ў іх. Аднак удзельнікі нашага конкурсу маюць у сваім багажы галоўнае — матывацыю. Яны ўжо паспыталі «журналісцкага хлеба» і, нягледзячы на пэўныя няўдачы, не збочылі з абранага шляху. Менавіта таму ўсе работы, якія былі апублікаваныя на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены», можна лічыць сапраўды найлепшымі. І мы раілі б патэнцыйным абітурыентам наступных гадоў браць прыклад ва ўсім менавіта з іх аўтараў.

Будзем шчырымі, не ўсе з апошніх паступяць на журфак. Проста таму, што нехта перадумае ў апошні момант, як гэта было ўжо неаднойчы з удзельнікамі і нават пераможцамі папярэдніх творчых конкурсаў. Гэта жыццё, нічога страшнага ў гэтым няма, калі малады чалавек вырашае абраць іншы жыццёвы і прафесійны шлях. Але ўменні знаходзіць тэмы, правільна выкладаць свае думкі на паперы, задаваць пытанні і літаратурна апрацоўваць тэкст могуць спатрэбіцца ў любой прафесіі. І мы будзем рады, калі наша пляцоўка для самавыяўлення творчай беларускамоўнай моладзі — «Чырвонка. Чырвоная змена» — зможа стаць карыснай у гэтым плане...

Але вернемся да падвядзення вынікаў конкурсу сезона 2017—2018 гадоў і невялікага «разбору палётаў». На жаль, як яно здараецца амаль заўсёды, не ва ўсіх аўтараў дасланыя работы адпавядалі тэме эпісталярнага творчага спаборніцтва. Адна з такіх «проб пяра» па гэтай прычыне надрукавана па-за конкурсам як звычайны журналісцкі матэрыял. Сярод удзельнікаў трэба адзначыць тых, хто даслаў больш за адну работу (нагадаем, умовамі гэта не забараняецца). Такіх аўтараў сёлета было тры. Калі гаварыць пра геаграфію, зноў жа традыцыйна па-за канкурэнцыяй прадстаўнікі маладзечанскага «Маладзіка» — адтуль прыйшла найбольшая колькасць «проб пяра».




Традыцыйныя ўзнагароды і памятныя прызы для найлепшых.

...А пераможцамі конкурсу, на думку рэдакцыйнага журы, сталі Паліна ПРАКАПЕНЯ, Анастасія ЯРАХНОВІЧ і Надзея БОБРЫК.

Паліна Пракапеня — са Смалявіч, скончыла лінгвістычны каледж — філіял Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Сёлета збіраецца паступаць на журфак. З «Чырвонкай. Чырвонай зменай» дзяўчына супрацоўнічала з пачатку восені мінулага года. Апроч работы на конкурс Паліна за кароткі тэрмін даслала яшчэ восем матэрыялаў. Большасць з іх ужо была надрукавана, астатнія з'явяцца на старонках дадатку ў наступных нумарах. Перамога ў конкурсе аўтарцы прысуджана за матэрыял «Хлопцы, не трэба!» («ЧЗ» ад 5.04.2018).

Анастасія Ярахновіч — выпускніца 11 класа сталічнай гімназіі № 12. Марыць стаць або дыктарам, або вядучай маладзёжнай праграмы. Сёлета таксама збіраецца паступаць на журфак, дзеля чаго наведвала падрыхтоўчыя курсы. Дзяўчына адзначана за матэрыял «Вялікае маленькае шчасце» («ЧЗ» ад 3.05.2018). Апроч яго ў Анастасіі была надрукавана яшчэ адна невялікая «проба пяра».

Чаму ў конкурсе перамаглі менавіта названыя творчыя работы? Як можна заўважыць, іх аб'ядноўвае жанр — эсэ. Гэта калі аўтар дзеліцца сваімі ўражаннямі і думкамі. Падавалася б, самае простае, што можа быць. Так памылкова думаюць многія маладыя аўтары, збіваючыся ў выніку на агульны пафас і транслюючы пэўныя штампы. Насамрэч жанр не такі просты. Індывідуальныя ўражанні павінны быць выкладзены па канкрэтнай, а не абстрактнай, нагодзе. Галоўнае — не збіцца на рэфлексіі, а прапусціць эмоцыі праз сябе. У аўторак гэта атрымалася. Іх матэрыялы ў найбольшай ступені адпавядаюць назве конкурсу: дзяўчаты выразна абазначылі, што не ўсё роўна для іх, а што — каштоўна: само жыццё, блізкія і родныя людзі, Радзіма... Паўторымся, гэта зусім не азначае, што «пробы пяра» астатніх аўтараў у нечым горшыя. У нашым конкурсе мы імкнёмся «трымаць планку». Паліна і Анастасія ўзнялі яе крыху вышэй за іншых.

Тое ж самае можна сказаць і пра трэцюю пераможцу — выпускніцу 11 класа маладзечанскай гімназіі № 7 Надзею Бобрык. Па-першае, дзяўчына ўдзельнічае ў нашым конкурсе не першы год. Па-другое, яна адна з тых трох аўтарак, якія сёлета даслалі па дзве «пробы пяра», што былі апублікаваны. Па-трэцяе, тэмы яе творчых матэрыялаў (што самае галоўнае) у нечым сугучныя з пасыламі дзвюх папярэдніх пераможцаў, толькі пададзеныя ў іншым жанры. Героі Надзеі — такія ж нераўнадушныя людзі, якія, ахвяруючы асабістым, прыходзяць на дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Тыя, хто ўласным прыкладам натхняе і вядзе за сабой іншых. Тыя, каму сапраўды не ўсё роўна... Найменш заўваг у рэдакцыйнага журы было да матэрыялу аўтаркі «У чым ён, цяжар сапраўднага лідарства?» («ЧЗ» ад 5.04.2018). Ён і прынёс Надзеі заслужаны поспех. Застаецца толькі дадаць, што дзяўчына, як і астатнія пераможцы, сёлета збіраецца паступаць на журфак, падоўжыўшы такім чынам сямейную дынастыю. Што цікава, дыплом і рэкамендацыя былі падпісаны ў дзень 17-годдзя аўтаркі! Тады ж мы патэлефанавалі ёй з запрашэннем наведаць рэдакцыю. Такія вось невялікія прыемныя супадзенні...

Пераможцы па традыцыі былі ўзнагароджаны дыпломамі і памятнымі прызамі ад Выдавецкага дома «Звязда». Паколькі ўсе тры аўтаркі сёлета збіраюцца «штурмаваць» журфак, ім таксама, згодна з умовамі конкурсу, былі ўручаны рэкамендацыі для паступлення. Шчыра віншуем і жадаем здзяйснення гэтай мары! Пераможцы гэта заслужылі па праве!

**Надзея НІКАЛАЕВА,**
**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Учреждение образования «Белорусский государственный университет транспорта»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ**

**на первую ступень послевузовского образования (аспирантуру) на 2018 год**

На первую ступень послевузовского образования **(аспирантуру)** на места, финансируемые из республиканского бюджета:

*на дневную форму по специальностям*

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 01.02.04 | Механика деформируемого твердого тела | 1 |
| 05.16.09 | Материаловедение (машиностроение) | 1 |

*на заочную форму по специальностям*

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 05.16.09 | Материаловедение (машиностроение) | 2 (1 целевое) |
| 05.22.08 | Управление процессами перевозок | 4 (1 целевое) |
| 05.23.23 | Архитектура зданий и сооружений, городских и сельских поселений, межселенных территорий | 2 |

*по форме соискательства по специальностям*

| Шифр | Специальность | План приема |
|---|---|---|
| 05.16.09 | Материаловедение (машиностроение) | 1 |
| 05.23.23 | Архитектура зданий и сооружений, городских и сельских поселений, межселенных территорий | 2 |

Подготовка в аспирантуре ведется не только за счет бюджетных средств, но и на платной основе, а также по специальностям:
01.01.06 – математическая логика, алгебра и теория чисел;
05.13.18 – математическое моделирование, численные методы и комплексы программ;
05.23.23 – строительные конструкции, здания и сооружения;
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством.
Срок получения послевузовского образования по дневной форме – 3 года, по заочной – 4 года, по форме соискательства – 5 лет.

**Прием документов с 28 августа по 28 сентября 2018 года по адресу: 246022, г. Гомель, ул. Кирова, 34 (каб. 272).**

**Справки по телефону: (8 0232) 95 34 95**

УНП 400057727

УНН 300002681

## УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины»

**ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС В ДОКТОРАНТУРУ, АСПИРАНТУРУ И МАГИСТРАТУРУ на бюджетную и платную формы обучения на 2018 год:**

| Специальности | Аспирантура: Всего | Аспирантура: Из них по форме обучения: Дневная | Заочная | Соискательство | Докторантура: Всего | Докторантура: Из них по форме обучения: Дневная | Соискательство |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 03.01.04 – биохимия | 2 | 1 | - | 1 | - | - | - |
| 03.02.11 – паразитология | 1 | - | - | 1 | - | - | - |
| 03.03.01 – физиология | - | - | - | - | 1 | 1 | - |
| 06.02.01 – диагностика болезней и терапия животных, патология, онкология и морфология животных | 4 | 2 | 2 | - | 1 | 1 | - |
| 06.02.02 – ветеринарная микробиология, вирусология, микология с микотоксикологией и иммунология | 6 | 2 | 2 | 2 | 1 | - | 1 |
| 06.02.04 – ветеринарная хирургия | 1 | 1 | - | - | - | - | - |
| 06.02.05 – ветеринарная санитария, экология, гигиена и ветеринарно-санитарная экспертиза | 2 | 1 | - | 1 | - | - | - |
| 06.02.06 – ветеринарное акушерство и биотехника репродукции животных | 2 | 1 | - | 1 | - | - | - |
| 06.02.07 – разведение, селекция, генетика и воспроизводство сельскохозяйственных животных | 2 | 1 | - | 1 | - | - | - |
| 06.02.10 – частная зоотехния, технология производства продуктов животноводства | 1 | - | 1 | - | - | - | - |

| Специальности магистратуры | Дневная форма обучения, бюджет | Заочная форма обучения, бюджет | Дневная форма обучения, платная основа | Заочная форма обучения, платная основа |
|---|---|---|---|---|
| 1-74 80 03 Зоотехния | 2 | 3 | - | - |
| 1-74 80 04 Ветеринария | 8 | 4 | 2 | 2 |

**Прием документов в аспирантуру осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2018 г.**

**Прием в аспирантуру осуществляется на конкурсной основе с 1 по 31 октября 2018 г.**

**Прием документов при поступлении в магистратуру с 18 по 24 августа 2018 г.**
**Вступительные экзамены – с 25 по 30 августа 2018 г.**

**Документы направлять по адресу: 210026, г. Витебск, ул. 1- Доватора, 7/11, научный отдел. Справки по телефону 51 73 77.**

УНП 300048858

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## «ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ П. М. МАШЕРОВА»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ**

**на 2018 год в соответствии с контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета по следующим отраслям науки и специальностям:**

| Организация-исполнитель | Шифр специальности | Аспирантура: Всего | Из них по форме обучения: Дневная | Заочная | Соискательство |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Витебский государственный университет имени П. М. Машерова | 01.01.02 – дифференциальные уравнения, динамические системы и оптимальное управление | 1 | | 1 | |
| | 05.13.18 – математическое моделирование, численные методы и комплексы программ | 1 | | 1 | |
| | 07.00.02 – отечественная история | 1 | | 1 | |
| | 09.00.11 – социальная философия | 1 | | 1 | |
| | 10.02.20 – сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание | 5 | 5 | | |
| | 17.00.09 – теория и история искусства | 5 | 2 | 2 | 1 |
| | 19.00.07 – педагогическая психология | 2 | | 2 | |
| **ВСЕГО** | | **16** | **7** | **8** | **1** |

**ВГУ имени П. М. Машерова объявляет также прием в аспирантуру для получения послевузовского образования (дневная, заочная формы, соискательство) за счет юридических и физических лиц на платной основе.**

**Документы для поступления принимаются с 1 августа по 30 сентября 2018 года по адресу:**

**210038, Витебск, Московский проспект, 33, кабинет 207.**

**Подробная информация – на сайте ВГУ имени П. М. Машерова http://www.vsu.by** (Рубрика «Магистрантам и аспирантам») **и по телефону 8 (0212) 47 56 26, e-mail: aspirantura@vsu.by**

УНП 100626652

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## «МЕЖДУНАРОДНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОЛОГИЧЕСКИЙ ИНСТИТУТ ИМЕНИ А. Д. САХАРОВА» БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ на 2018 год**

**в соответствии с контрольными цифрами приема (Приказ ГКНТ Республики Беларусь № 151 от 24.05.2018) для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета по специальностям (биологические и технические науки)**

| Организация-исполнитель | Организация-заказчик | Отрасль науки | Шифр специальности | Аспирантура: Всего | Из них по форме обучения: Дневная | Заочная |
|---|---|---|---|---|---|---|
| УО «МГЭИ им. А. Д. Сахарова» БГУ | Организация-исполнитель | 03.00.00 | 03.01.01 – радиобиология | 2 | 2 | 0 |
| | | | 03.01.04 – биохимия | 1 | 0 | 1 |
| | | | 03.02.08 – экология | 2 | 0 | 2 |
| | Организация-исполнитель | 05.00.00 | 05.11.10 – приборы и методы для измерения ионизирующих излучений и рентгеновские приборы | 1 | 0 | 1 |
| | | | 05.11.13 – приборы и методы контроля природной среды, веществ, материалов и изделий | 1 | 0 | 1 |
| Итого | | | | 7 | 2 | 5 |

В аспирантуру на конкурсной основе принимаются лица, имеющие диплом о высшем образовании и диплом магистра, склонность к научным исследованиям. Поступающие должны иметь опыт практической работы не менее двух лет либо рекомендацию совета вуза или факультета вуза.

УО «МГЭИ им. А. Д. Сахарова» БГУ объявляет также прием в аспирантуру по указанным выше специальностям и докторантуру по специальности 03.02.08 – экология для получения послевузовского образования за счет юридических и физических лиц на платной основе.

**Поступающие в аспирантуру сдают вступительный экзамен по специальности в период с 5 по 20 октября 2018 года, соискатели экзаменов не сдают.**

**ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ с 1 августа по 30 сентября 2018 года**

**Наш адрес: 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 23/1, каб. 405, тел. 398 93 44**
**Подробности на сайте: http:/www.iseu.by.**

## Учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ НА 2018 ГОД**

по следующим отраслям наук и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе

**АСПИРАНТУРА***

| Специальность | Форма получения образования: дневная | заочная | соискательство |
|---|---|---|---|
| **05.00.00 – Технические науки** | | | |
| 05.19.08 – товароведение, экспертиза и безопасность непродовольственных товаров и сырьевых материалов | 1 | — | 1 |
| **08.00.00 – Экономические науки** | | | |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством | 10 | 3 | 1 |
| 08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит | 3 | — | — |
| 08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика | 3 | 3 | 1 |
| 08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики | 1 | — | — |
| 08.00.14 – мировая экономика | 2 | — | — |
| **12.00.00 – Юридические науки** | | | |
| 12.00.02 – конституционное право; конституционный процесс; муниципальное право | 1 | 1 | — |
| 12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право | 2 | — | — |
| 12.00.14 – административное право, административный процесс | — | — | 1 |
| **23.00.00 – Политические науки** | | | |
| 23.00.02 – политические институты, процессы и технологии | 1 | — | — |
| 23.00.04 – политические проблемы международных отношений глобального и регионального развития | 1 | — | — |

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы аспирантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в заочной форме получения образования — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

**ДОКТОРАНТУРА***

| Специальность | Форма получения образования: дневная | соискательство |
|---|---|---|
| **08.00.00 – Экономические науки** | | |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством | 1 | 1 |
| 08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика | 1 | 2 |

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение содержания образовательной программы докторантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12.2011 № 561).

Лица, поступающие в аспирантуру и докторантуру БГЭУ, предварительно проходят собеседование на профильных кафедрах.

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

**Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГЭУ — 1 ноября 2018 года.**

**По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГЭУ обращаться: 220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 26, учебный корпус 6, комн. 17. Тел. (+375 17) 209-78-85 E-mail: aspirantura@bseu.by**

**Прием документов в аспирантуру и докторантуру с 1 августа по 30 сентября 2018 года.**
**Время работы приемной комиссии: с 9.00 до 12.30 и с 14.00 до 16.30.**
**Проезд: трол. 3, 15, 16, 17, 34, 41, авт. 59, 79, 93 до ост. «Площадь Ванеева».**

УНП 100015608

УНП 300031282

## Учреждение образования «ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНОЛОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА 2018 ГОД**

**в соответствии с контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета по следующим специальностям:**

| Шифр и наименование специальности | Аспирантура: Всего | Из них по форме получения образования: Дневная | Заочная |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 05.02.08 – Технология машиностроения | 3 | 3 | - |
| 05.02.13 – Машины, агрегаты и процессы (легкая промышленность) | 1 | - | 1 |
| 05.13.06 – Автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (легкая промышленность) | 1 | 1 | - |
| 05.19.02 – Технология и первичная обработка текстильных материалов и сырья | 4 | 3 | 1 |
| 25.03.13 – Геоэкология | 1 | 1 | - |
| Всего | 10 | 8 | 2 |

**Также осуществляется прием в аспирантуру и докторантуру за счет средств юридических и физических лиц.**

**Документы для поступления принимаются с 1 августа по 30 сентября 2018 года.**

**Полную информацию можно получить по адресу: 210035, г. Витебск, Московский пр-т, 72, аспирантура, тел. 8 (0212) 49-53-21.**

**Подробности на сайте: www.vstu.by**

*Працоўны семестр*

# ПАТУШЫЦЬ «ЗЯЛЁНЫ ПАЖАР»

## У гэтым галоўная задача байцоў палявога «фронту»


На поле — з матыкай і бадзёрым настроем.

**Добрая навіна для студэнтаў, чыё лета праходзіць на бабуліных градах, — навыкі праполкі можна «прадаць». Напрыклад, уладкаваўшыся ў сельскагаспадарчы атрад. Адзін з такіх, у складзе якога хлопцы і дзяўчаты з БДУ, якраз цяпер працуе на ўніверсітэцкім вучэбна-вопытным прадпрыемстве «Шчомысліца».**

У гадавальніку дэкаратыўных раслін разводзяць дрэвы, кусты, хвойнікі і кветкі. Амаль усё гэта прадаецца сталічным службам азелянення. Студэнты сюды прыходзяць на практыку часта. Хлопцы і дзяўчаты з біялагічнага факультэта ставяць доследы над раслінамі: бяруць тут узоры і вырошчваюць у лабараторыі ў прабірках. Ці вывучаюць паразітычныя грыбы. А студэнты геаграфічнага факультэта бяруць пробы грунту.

Тыя ж, хто трапіў летам на працу ў атрад, шчыруюць у асноўным на праполцы.

— Мы прасілі на чэрвень людзей паболей, бо ўсе сілы ідуць на тое, каб патушыць «зялёны пажар». Выратаваць пасевы ад пустазелля — галоўная задача. Дзесьці дапамагаюць гербіцыды, але не ўсё можна даверыць «хіміі», — тлумачыць **першы намеснік дырэктара прадпрыемства Дзмітрый КАЛБАНАЎ.** — У ліпені стане крыху лягчэй з праполкай, можа, будзем прыцягваць моладзь да чаранкавання.

Барацьба з пустазеллем у студэнтаў пачынаецца з васьмі раніцы. Пакуль іх аднакурснікі адсыпаюцца, байцы атрада ўжо на палявых «пазіцыях» — з матыкамі, тачкамі і працоўным настроем.

Адседзецца ўбаку не атрымаецца — плацяць за колькасць выкананай работы. Расцэнкі такія: за квадратны метр — дзевяць капеек. Студэнты кажуць, што за дзень паспяваеш прапалоць каля 50 метраў, а значыць, зарабіць чатыры рублі. Усяго за змену (два тыдні) атрымліваецца рублёў 50. Плюс самым старанным паабяцалі прэмію.

**Камісар атрада Тацццяна СЛІНЧАК** вучыцца на трэцім курсе эканамічнага факультэта. Яна — будучы спецыяліст па фінансах і крэдытах.

— Я стараюся актыўна ўдзельнічаць у жыцці ўніверсітэта. Ужо не першы год уступаю ў студэнцкі атрад. Прычын некалькі. Так у актывістаў больш шанцаў атрымаць пакой у інтэрнаце, а таксама гэта новыя вопыт, знаёмствы, невялікі, але заробак.


Хлопцы кажуць, што работа не складаная. Тым больш у кампаніі не сумна.

Летась дзяўчына ездзіла ў лагер важатай. На гэты год вырашыла паспрабаваць сябе ў іншай дзейнасці. Да працоўнага месца не вельмі далёка дабірацца, таму застаецца больш вольнага часу.

Цікавімся: колькі сёння студэнту трэба грошай на месяц? Тацццяна задумваецца. «Мінімум — рублёў 150: на ежу, праязны, інтэрнэт... Расходаў хапае». Пакрываць іх дзяўчыне дапамагаюць бацькі — падпрацоўкі ў яе няма. Тлумачыць, што складана сумяшчаць дзённае навучанне і работу, бо наймальнікі звычайна шукаюць спецыялістаў на поўную стаўку.

На што патраціць студатрадаўскі заробак, будучы эканаміст пакуль не вырашыла. «Можа, куплю абанемент у басейн ці трэнажорную залу. Заўсёды трэба быць у форме», — усміхаецца.

**Трэцякурснік мехмата Дзмітрый МАЧАЛАЎ** грузіць пустазелле на тачку.

— Працаваць не асабліва складана — толькі калі спякотна бывае. Да таго ж прыемны калектыў, шмат прыгожых дзяўчат, — дзеліцца хлопец.

За мінулыя гады ён паспеў паспрабаваць сябе ў будаўнічым і сэрвісным атрадах. У апошнім працаваў афіцыянтам у піцзоркавымі гатэлі. Успамінае, што менавіта ў сэрвіс-атрадзе атрымліваў больш за ўсё. «За месяц можна было спакойна зарабіць рублёў 500. На гэтыя грошы рэальна жыць».

Дзмітрый, дарэчы, ужо год працуе ў той гасцініцы — яго афармілі па дагаворы падраду. Спачатку быў афіцыянтам, цяпер правярае пакоі. Пары ў хлопца ў другую змену, таму работу бярэ на раніцу.

— Гэтая часовая падпрацоўка, — папярэджвае. — Пазней я планую пайсці на курсы ў IT-кампанію і ў далейшым там працаваць.

На заробленае Дзмітрыю ўдалося купіць новы тэлефон, схадзіць з дзяўчынай у кавярню. Жартуе, што другі пункт расходаў вельмі дарагі.

На гадзінніку поўдзень — час паабедаць. Атрадаўцы бягуць у бытоўку па «ссабойкі». А мы працягваем гутарыць з імі.


Папрацавалі — можна і паесці.

**Дзіяна БЯЗЗУБЕНКА, трэцякурсніца філфака,** у студатрадзе першы раз.

— Жыццёвы вопыт, набыты ў бабулі на агародзе, вельмі спатрэбіўся, — усміхаецца. — Цяпер не так хутка стамляюся і магу зрабіць работы нават крыху больш за іншых. Не шкадую, што запісалася ў атрад, мне падабаецца. Тут адпачываеш на свежым паветры.

Адзіная складанасць — паралельна трэба рыхтавацца да сесіі. А паколькі байцы вучацца на розных спецыяльнасцях, экзамены ва ўсіх розныя — канспект на полі разам не пачытаеш.

**Будучы філолаг Ілона ЖАЎТОК** заканчвае чацвёрты курс. Расказвае, што ў ліпені таксама будзе працаваць у студатрадзе: можа, на сельскагаспадарчым прадпрыемстве, а можа, у «Мінсктрансе» — кантралёрам. Але і падчас навучальнага года дзяўчына без работы не сядзела. Часам па выхадных, калі прыязджала на радзіму ў Астравец, спявала на вяселлях. Заробленае адкладала на адпачынак. «Планую паехаць у жніўні, яшчэ не вырашыла куды».

Па падліках Ілоны, мінімальны пражытковы мінімум для студэнта — 200 рублёў. Гэта калі траціцца толькі на ежу. А калі хочаш набываць штосьці-небудзь з адзення і ў кіно хадзіць, то на месяц рублёў 400 спатрэбіцца.

Але шопінг і забавы — пазней. Пакуль чакаюць грады. «На два тыдні забыліся на манікюр. Нічога, пасля змены будзем аднаўляцца, — смяецца дзяўчына. — Нам тут не сумна».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Смачна есці!*

# Калорыі па прымальных цэнах



**Добрая навіна для студэнтаў — цяперашніх і тых, хто стане імі ў найбліжэйшы час, а таксама іх бацькоў і выкладчыкаў (як той казаў, добры студэнт — сыты студэнт): у краіне ўстановяць адзіны парадак фарміравання цэн і нацэнак на прадукцыю грамадскага харчавання, што рэалізуецца ва ўстановах адукацыі. Раней пытанні цэнавага рэгулявання ў гэтай сферы знаходзіліся ў кампетэнцыі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.**

У заканадаўства былі ўнесены змяненні ў частцы перадачы Міністэрству антыманапольнага рэгулявання і гандлю паўнамоцтваў па рэгуляванні цэн і нацэнак на прадукцыю грамадскага харчавання, якая рэалізуецца ва ўстановах адукацыі. Прычынай прыняцця такога рашэння паслужыла выяўленне шматлікіх парушэнняў парадку фарміравання цэн на прадукцыю грамадскага харчавання ва ўстановах адукацыі, а таксама неабходнасць замацавання выразных нормаў для скарачэння колькасці пастаўшчыкоў-пасярэднікаў прадуктаў харчавання.

Для таго каб выключыць двайное тлумачэнне пры фарміраванні цэн, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю распрацавала метадычныя рэкамендацыі. Сутнасць іх у тым, што гандлёвая надбаўка ў памеры 20 працэнтаў прымяняецца не да цаны апошняга пастаўшчыка, а да цаны вытворцы. Такім чынам будзе вырашацца і праблема пасярэднікаў.

Гэтыя змяненні ўступяць у сілу з 27 жніўня, перад самым пачаткам новага навучальнага года. Так што смачна і танна есці, школьнікі і студэнты!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Для ўсіх ахвотных*

# АТРАДЫ — НА ЛЮБЫ ГУСТ, ВЫБІРАЙ!

**34 студэнцкія педагагічныя атрады створаны ў БДПУ. У іх склад увайшлі найлепшыя студэнты, якія маюць поспехі ў вучобе, з'яўляюцца лідарамі грамадскіх арганізацый, маюць вопыт педагагічнай дзейнасці. Усе яны навучаліся ў школе важацкага майстэрства.**

— Для дзесяці педатрадаў ужо наступілі працоўныя будні. Студэнты задзейнічаны ў дзіцячых аздараўленчых лагерах, спартыўна-аздараўленчых комплексах, цэнтрах рэабілітацыі, а таксама ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», — расказала **начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДПУ Святлана МАЛІНОЎСКАЯ.** — У прыватнасці, педагагічны атрад факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій «Ніка» працуе ў спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна», «Імпульс» (Інстытута псіхалогіі) — у аздараўленчым комплексе «Ракета», «Шыпшына» — у аздараўленчым летніку «Барок» (філалагічны факультэт), «Беларусачка» — у пансіянаце «Зорны» (зводны атрад факультэта фізічнага выхавання і Інстытута псіхалогіі), «Ветразь» — у дзіцячых аздараўленчых лагерах «Спадарожнік» і «Палітэхнік».

Акрамя таго, у летні перыяд студэнты БДПУ будуць працаваць у складзе васьмі студэнцкіх сэрвісных атрадаў, сфарміраваных БРСМ Кастрычніцкага раёна сталіцы. Хлопцы і дзяўчаты будуць рыхтаваць інтэрнаты студэнцкага гарадка да новага навучальнага года.

Трынаццаць студэнцкіх атрадаў сфарміраваны Штабам працоўных спраў Белдзяржуніверсітэта. У гэтым месяцы да працы ўжо прыступілі сем педагагічных, два сельскагаспадарчыя і чатыры сэрвісныя. Запіс у студэнцкія атрады працягваецца ў суполцы Штаба працоўных спраў БДУ ў «УКантакце» https://vk.com/rabotabrsmbsu. Мяркуецца, што працоўны семестр працягнецца да пачатку верасня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
21 06 2018 г.

В 2018 году в аспирантуру учреждения образования

## «МОЗЫРСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ И. П. ШАМЯКИНА»

**объявлен набор лиц по следующим специальностям**

на дневную форму получения послевузовского образования

| Шифр | Специальность | Срок обучения | План приема |
|---|---|---|---|
| 01.04.07 | Физика конденсированного состояния | 3 года | 2 |
| 10.02.01 | Белорусский язык | 3 года | 1 |

**Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2018 года**

**по адресу: г. Мозырь, ул. Студенческая, 28, ауд. 220.**

**Справки по телефону +375 236 32 43 79.**

УНП 400083888

**С 1 августа по 30 сентября 2018 года будет осуществляться прием документов в адъюнктуру и докторантуру Университета гражданской защиты МЧС Беларуси**

**В АДЪЮНКТУРУ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:**

05.26.02 – безопасность в чрезвычайных ситуациях (1 место – заочная форма получения образования);
05.26.03 – пожарная и промышленная безопасность (1 место – очная форма получения образования, 1 место – заочная форма получения образования, 1 место – получение образования в форме соискательства);
05.26.07 – гражданская оборона (1 место – получение образования в форме соискательства).

**В ДОКТОРАНТУРУ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:**

05.26.02 – безопасность в чрезвычайных ситуациях (1 место – получение образования в форме соискательства);
05.26.03 – пожарная и промышленная безопасность (2 места – получение образования в форме соискательства).

**Телефон для справок – 8-017-345-33-54.**

УНП 192695026

УНП 400073500

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## «ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ П. О. СУХОГО»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ НА 2018 ГОД**

**ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА**

| Шифр и название специальности | Дневная форма | Заочная форма |
|---|---|---|
| 05.13.05 Элементы и устройства вычислительной техники и систем управления | 1 | |
| 05.14.04 Промышленная теплоэнергетика | | 2 |
| 08.00.05 Экономика и управление народным хозяйством | | 1 |

**Документы принимаются** с 1 августа по 30 сентября 2018 года по адресу: г. Гомель, пр-т Октября, 48, кабинет 1-601.
**Информацию можно получить:** по тел. 8 (0232) 40 03 98; на сайте университета www.gstu.by; e-mail: aspirantura@gstu.by

Учреждение образования

## «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ В 2018 ГОДУ**

**по следующим специальностям:**

| СПЕЦИАЛЬНОСТИ | План набора. Форма обучения: Дневная | Заочная | Соискательство |
|---|---|---|---|
| 05.20.01 – технологии и средства механизации сельского хозяйства | 1 | 2 | - |
| 05.20.02 – электротехнологии и электрооборудование в сельском хозяйстве | 1 | 1 | 1 |
| 05.20.03 – технологии и средства технического обслуживания в сельском хозяйстве | 1 | 1 | - |
| 05.13.06 – автоматизация и управление технологическими процессами и производствами (в сельском хозяйстве) | 1 | - | - |
| 05.14.08 – энергоустановки на основе возобновляемых видов энергии | 1 | - | - |
| 05.05.03 – колесные и гусеничные машины | - | - | 1 |
| 05.18.12 – процессы и аппараты пищевых производств | 1 | - | - |
| 08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством | 1 | 1 | - |

**Прием документов** – с 1 августа по 30 сентября 2018 г.

**Вступительные экзамены по специальности** – с 10 по 21 октября 2018 г.

**Начало занятий** – 1 ноября 2018 года.

**Адрес приемной комиссии:**
220023, г. Минск, пр-т Независимости, 99, к. 5-1, каб. 504
(тел. 8-017-385-91-07)

УНН 100185315

*Класныя навіны*

# ПАДРУЧНІК З ДАПОЎНЕНАЙ РЭАЛЬНАСЦЮ

**44 новыя навучальныя дапаможнікі для школьнікаў будуць выдадзены да 1 верасня.**




У першую чаргу будзе абноўлена ўся лінейка падручнікаў і дапаможнікаў для чацвёртых і восьмых класаў. Гэта звязана з абнаўленнем у гэтых класах навучальных праграм па ўсіх прадметах. Таксама будуць выдадзены навучальныя дапаможнікі па замежных мовах для трэцяга, шостага, дзявятага і дзясятага класаў.

Новыя кнігі па матэматыцы і інфарматыцы, а таксама па працоўным навучанні пакладуць у свой партфель шасцікласнікі.

Асноўныя крытэрыі, якія захоўваліся пры стварэнні новых падручнікаў, — гэта даступнасць выкладання вучэбнага матэрыялу, практыка-арыентаванасць задач і практыкаванняў, рэалізацыя розных формаў прадстаўлення інфармацыі і рэалізацыя міжпрадметных сувязяў. Вучні будуць працаваць не толькі з суцэльным тэкстам, але і з графікамі, дыяграмамі і табліцамі.

Акрамя гэтага, новыя навучальныя дапаможнікі будуць змяшчаць спасылкі на розныя кампаненты вучэбна-метадычных комплексаў па прадметах. Настаўнік атрымае магчымасць дыферэнцаваць адукацыйны працэс. Для дзяцей, якія праяўляюць цікавасць да прадмета, прадугледжаны дадатковы кантэнт, які дапаможа паглыбіць веды і адпрацаваць атрыманыя навыкі.

Таксама ў новых навучальных дапаможніках будзе выкарыстоўвацца тэхналогія дапоўненай рэальнасці. Яна дазваляе «ажыўляць» карцінкі і ў большай ступені візуалізаваць матэрыял, што вывучаецца. Загрузіўшы бясплатна на электронную прыладу адпаведныя праграмы, вучні змогуць больш дакладна ўявіць вывучаемыя з'явы. Тэхналогія будзе рэалізавана ў падручніках па фізіцы і па мастацтве для восьмага класа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

УНП 200050321

## Учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина»

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ

**НА ДНЕВНУЮ И ЗАОЧНУЮ ФОРМЫ ПОЛУЧЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ НА ОБУЧЕНИЕ ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА**

*(в соответствии с Контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета на 2018 год, установленными приказом ГКНТ Республики Беларусь* ***от 24.05.2018 № 151)***

**ПО СЛЕДУЮЩИМ ОТРАСЛЯМ НАУКИ И СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ**

| Отрасль науки | Шифр и наименование специальности | Форма получения образования | Количество мест |
|---|---|---|---|
| **Физико-математические науки** | 01.01.07 – Вычислительная математика | соискательство | 1 |
| **Педагогические науки** | 13.00.01 – Общая педагогика, история педагогики и образования | дневная | 2 |
| | 13.00.08 – Теория и методика профессионального образования | дневная | 1 |
| **Психологические науки** | 19.00.07 – Педагогическая психология | дневная | 1 |
| | | заочная | 1 |

Также осуществляется прием в аспирантуру на дневную и заочную формы получения образования, а также в форме соискательства на обучение за счет средств юридических и физических лиц по всем научным специальностям, открытым в аспирантуре университета.

Срок получения образования: дневная форма – до 3 лет, заочная – до 4 лет, соискательство – до 5 лет.

Прием документов для поступления в аспирантуру **с 1 августа по 30 сентября 2018 года.**

Вступительные экзамены проводятся **с 10 по 20 октября 2018 года.**

Документы принимаются по адресу:
**224016, г. Брест, бульвар Космонавтов, 21,**
УО «БрГУ имени А. С. Пушкина»,
заведующий аспирантурой (каб. 124),
телефон для справок: 21-92-43.

**Дополнительная информация на сайте:**
**www.brsu.by/Образование/Аспирантура**

УНП 200002511

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## «БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

объявляет прием в аспирантуру на дневную и заочную формы получения образования на обучение за счет средств республиканского бюджета на 2018 год, установленные приказом Государственного комитета по науке и технологиям Республики Беларусь от 24 мая 2018 г. № 151, по следующим отраслям науки и специальностям

| Отрасль науки | Шифр и наименование специальности | Форма получения образования | Количество мест |
|---|---|---|---|
| Технические науки | 05.13.15 – Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети | заочная | 1 |
| | 05.23.01 – Строительные конструкции, здания и сооружения | дневная, заочная | 3 1 |
| | 05.23.08 – Технология и организация строительства | дневная | 1 |
| Экономические науки | 08.00.05 – Экономика и управление народным хозяйством | дневная | 1 |
| Науки о земле | 25.03.13 – Геоэкология | дневная, заочная | 2 1 |

Также осуществляется прием в аспирантуру на дневную и заочную формы получения образования, а также в форме соискательства на обучение за счет средств юридических и физических лиц по следующим научным специальностям

| | |
|---|---|
| **01.00.00** | **Физико-математические науки** |
| 01.02.04 | Механика деформируемого твердого тела |
| **05.00.00** | **Технические науки** |
| 05.02.02 | Машиноведение, системы приводов и детали машин |
| 05.02.04 | Трение и износ в машинах |
| 05.13.15 | Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети |
| 05.14.04 | Промышленная теплоэнергетика |
| 05.23.01 | Строительные конструкции, здания и сооружения |
| 05.23.02 | Основания и фундаменты, подземные сооружения |
| 05.23.04 | Водоснабжение, канализация, строительные системы охраны водных ресурсов |
| 05.23.05 | Строительные материалы и изделия |
| 05.23.08 | Технология и организация строительства |
| 05.23.17 | Строительная механика |
| **08.00.00** | **Экономические науки** |
| 08.00.05 | Экономика и управление народным хозяйством |
| **25.00.00** | **Науки о земле** |
| 25.03.13 | Геоэкология |

**Срок обучения: дневная форма – до 3 лет, заочная – до 4 лет, соискательство – до 5 лет.**

**Прием документов для поступления в аспирантуру с 1 августа по 30 сентября 2018 года.**

**Вступительные экзамены проводятся с 10 октября по 20 октября 2018 года.**

**Документы принимаются по адресу:**
**224017 г. Брест, ул. Московская, 267, БрГТУ,**
**аспирантура (каб. 5/109), телефон для справок: 42-26-45.**

**Дополнительная информация на сайте:**
**www.bstu.by**

*Друкуецца ў «Маладосці»*

# У ЭФІРЫ СОН

*Урывак*



Дар'я ЗНАЧОНАК

**Аўтарцы 22 гады. Яна з адзнакай скончыла факультэт прынттэхналогій і медыякамунікацый БДТУ, працуе рэдактарам у выдавецка-паліграфічным цэнтры БДАТУ. Сярод найбольш моцных захапленняў — авіяцыя і ўсё звязанае з ёю, асабліва ў кантэксце Вялікай Айчыннай вайны. Дыпламант літаратурных конкурсаў «Аўтограф» (2014) і «Першацвет» (2016), фіналіст конкурсу «БрамаМар» (2017).**

ЭКРАНЫ, якія шырокім паўкругам абступалі пульт кіравання, стракацелі схемамі і праграмнымі кодамі, але галоўны экран — самы вялікі — пакуль пуставаў. Ды і што яму паказваць, калі ў эфіры зараз «фортка»? Недзе ў неверагодная далечыні кліент (а дакладней, кліентка) у непрытомнасці матыляецца паміж зямным светам і светам нябесным, і перавага апошняга робіцца прыкметнейшай з кожнай хвілінай. У такія моманты нават перадавыя кампаніі больш не імкнуцца ўвапхнуць у эфір сон-другі: надыходзіць час спецыяльнага сну, якім сімвалічна завяршаецца жыццё чалавека. Сцэнарыі могуць быць розныя, але ў выпадках, падобных гэтаму, развязку яны маюць аднолькавую. Такая ўжо спецыфіка сноў-перадсмяротнікаў.

КУДЛАТЫ аператар-стажор па мянушцы Пірат насуплена гайдаўся на стуле, скрыжаваўшы рукі на грудзях. На фоне гэтага неахайнага гарбаватага хлапчыны Пашка выглядаў сапраўдным джэнтльменам — хоць бы таму, што старанна трымаў плечы распраўленымі, быццам кіраваў не сном, а баявымі дзеяннямі. Праўда, у рэжысёра атрымлівалася нашмат прыгажэй і натуральней, але Пашка не журыўся. Калі намагаешся наблізіцца да ўзроўню майстра, напачатку пераплюнь дылетантаў, а пакрысе і сераднячкі адпадуць. Тут галоўнае — звычка і ўпартасць. Нават не важна, што трымаць спіну пакуль удаецца толькі за пультам.

ПАШКА выключыў абодва галаўныя мікрафоны (свой і Піратаў), паправіў навушнік, каб не прапусціць выклік дыспетчара, і пакасіўся на хмурнага суседа:

— Чаго хандрыш? Дай угадаю: ізноў заўвага?

— Што значыць ізноў? І што значыць заўвага? — імгненна ашчэрыўся той. — Ты не блытай, у мяне толькі «апошнія папярэджанні». Розніца! Плюс учарашняе дзяжурства было дзённае, а днём да мяне не прыкалупваюцца. Няма сноў — няма папярэджанняў, лагічна?

— Калі добра пастарацца, можна і ў час «форткі» атрымаць на арэхі, — са значэннем хмыкнуў Пашка. — Асабліва калі бузіць на рабочым месцы.

Пірат праз сціснутыя зубы гыркнуў:

— А цябе хіба не выводзіць гэты міністэрскі правяральшчык? Якога хрэна ён прыпёрся за паўгадзіны да эфіру? А яго першая фраза — увогуле проста трэш! «Малады чалавек, не маглі б вы растлумачыць, чаму каманда яшчэ не ў зборы?»

Пашка зрабіў выгляд, што паліруе рукавом куточак аднаго з экранаў, а сам утаропіўся ў цьмянае адлюстраванне студыі — звыклы прыёмчык, які дазваляў паспяхова сачыць за прысутнымі, не прыцягваючы іх увагі. Нежаданы візіцёр прымасціўся на канапе за часопісным столікам і дэманстратыўна кідаў позіркі на наручны гадзіннік. І гэта пры тым, што літаральна насупраць, паміж экранамі, заклікальна свяцілася масіўнае табло гадзінніка электроннага; нават безнадзейна блізарукая вахцёрка цёця Тося бачыла лічбы ажно з калідора, і для гэтага ёй не патрабаваліся ніякія дадатковыя прылады. Посны выраз твару міністэрскага служачага наводзіў на думку, што ён мысленна выкрэслівае адзін пункт патрабаванняў за другім: і гэта яму не так, і тое не гэтак... Адным словам, на яго думку, маленькая кампанія SkyDream не выглядала сур'ёзнай арганізацыяй, якую ён мог бы ўважыць сваёй прысутнасцю. Так, ахламоны нейкія!

СІТУАЦЫЮ не ратаваў і Сямён Данілавіч, кругленькі пажылы работнік з аддзела лёсаў, які, падсеўшы да госця, раз-пораз рабіў няўклюдныя спробы ўцягнуць яго ў размову. У добрых вачах Сямёна Данілавіча трапятала пакутлівая няёмкасць: ну не ўмеў ён забаўляць усялякіх важных персон, ну не ведаў, з якога боку да іх падступіцца! Кожная няўдалая фраза ўганяла яго глыбей у бездань засмучэння, і ён змаўкаў, разгублена паціраючы рукі.

Магчыма, у такіх абставінах самым правільным было ўмяшацца і нейкім чынам выручыць бедака, але Пашка працягваў маладушна вытарэшчвацца ў экран, адчуваючы, як у грудзях непрыемна варушыцца сорам. «Я вядучы аператар, у мяне дзяжурства, — вяла абараняўся ён, цудоўна разумеючы, што гэта не апраўданне. — Вы трымайцеся там, дзядзя Сём, а я потым раздабуду вам білеты на які архіўны зямны кінафільм...»

Вядомая рэч, выкладваць усё гэта Пірату — не варыянт, таму Пашка толькі ўхілісты мармытнуў:

— Хто б мяне ні выводзіў, гэта не нагода шукаць праблемы на сваю галаву. І я не хацеў бы запароць Хрысцінкін дыпломны праект. Дзяўчо расстроіцца...

Пірат закаціў вочы:

— А дзе ж яна дасюль швэндаецца, Хрысціначка наша ненаглядная? Нешта яе не цікавіць лёс уласнага дыплома!

— Ну, спазняецца, падумаеш. Студэнты такія студэнты... Дык і надвор'е не цукар: дождж так і лупіць, хутка вынесе вокны. Ты як, плаваць умееш?

— Яшчэ і не тое ўмею. Зараз у гэнага рэвізора выдатна паплыве ў вачах. Сядзіць увесь такі нявінны: на каленках нататнічак, на носе акулярчыкі, зенкамі лып-лып... А сам сканіруе — дзе б да чаго прычапіцца? Проста шалею ад такіх суб'ектаў, ажно рукі свярбяць!

Тут ужо пасуравеў і памяркоўны Пашка:

— Ану, завяжы свае рукі вузлом і сачы за паказаннямі прыбораў! Не хапала яшчэ, каб гэты фрукт і насамрэч якуюсьці паперку накатаў. Дзякуй богу, ад цябе тут нічога не залежыць, хіба толькі я сам напартачу.

ПІРАТ непакорліва прыжмурыў адно вока, як бы прымяраючыся да вытанчанай контратакі, але ў студыю, ляпнуўшы дзвярыма, куляй уляцела мокрая як мыш Хрысцінка: капюшон курткі насунуты на самыя вочы, з чорных хвосцікаў струменіцца дажджавая вада.

— Усім-дзень-добры-колькі-да-эфіру? — скорагаворкай прапыхкала яна, ледзь пераводзячы дух.

— Шэсць хвілін і трыццаць пяць секунд, — машынальна азваўся Пашка, зірнуўшы на таймер у кутку экрана.

— Фу-у-ух, паспела... — Хрысцінка знясілена прыхілілася да сцяны.

Павесялелы Пірат рагатнуў:

— Пашка, бач ты — некаму ўсё ж прыйшлося плысці!.. Чаго парасон не прыхапіла? Горда гартуешся, гаротніца?

— Я і хацела ўзяць, але ў апошні момант перадумала. Само сабой, варта было выйсці — дождж лінуў!

— Дык вярнулася б. Ці ты прымхлівая?

Адціскаючы з хвосцікаў ваду, Хрысцінка вымучана ўсміхнулася:

— У інтэрнаце ліфт зламаўся, дык у мяне ўжо трэці дзень нешта накшталт пазапланавай фізкультуры. Чатырнаццаць паверхаў уніз, чатырнаццаць угору...

Пірат прысвіснуў:

— Ого, як жа ты ногі цягаеш? Ну ты, блін, спартсменка-камсамолка! Я б ужо і поўзаць развучыўся.

Хрысцінка адліпла ад сцяны, пацерла твар і сама сабе скамандавала:

— Не спаць, не спаць, вочы не заплюшчваць... Так, усё, час працаваць. Стартую!

ЯНА сцягнула куртачку, метка закінула яе на кручок вешалкі — абцякаць — і таропка пашлёпала да пульта кіравання, пакідаючы мокрыя сляды.

— Вой, і вам добры дзень! — спахапілася яна, прыкмеціўшы за часопісным столікам незнаёмца.

— Добры-добры, — кісла павітаўся рэвізор. Яго ідэальна сухое паліто вісела на суседнім кручку, і былі ўсе падставы апасацца, што такім яно застанецца ненадоўга.

Уцягнуўшы галаву ў плечы, Хрысцінка хутчэй шмыгнула да Пашкі з Піратам і зашаптала:

— А гэта што яшчэ за дзядзька?

— З Міністэрства лёсаў, — нягучна растлумачыў Пашка. — Будзе правяраць, ці не сапсуём мы праграму эфіру, якую яны там распрацавалі для кліента.

— Але ж у нас перадсмяротнік! — акругліла вочы Хрысцінка. — Нашто правяраць, калі жыцця больш не будзе?

— Вось і я хачу запытацца, — прабурчэў Пірат. — Па-мойму, лёсавікі шныраць проста для ўласнага задавальнення, каб пазнаходзіць памылачкі. Добра хоць не ва ўсе сны лезуць, а то мы б ужо адурэлі. І ахвота ім марнаваць час? Можна спрасціць на раз-два: пагарталі сцэнарый, чырканулі грыф узгаднення — і баста! Не трэба цягацца па студыях, кантраляваць... Я б так і рабіў. Тым больш з перадсмяротнікамі.

ХРЫСЦІНКА няўцямна паміргала.

— Так-так-так, спакойна... Мне капец, — паўнепрытомна канстатавала яна.

— З бульбай? — не ўтрымаўся Пірат, але Хрысцінка ўжо паплялася да «апендыкса» пульта кіравання — стала з некалькімі дадатковымі камп'ютарамі. Дзяжурны медык Віталіч, сонна прыапусціўшы павекі, меланхалічна пазіраў у свой манітор, куды выводзіліся паказальнікі стану кліенткі. Хрысцінка накіравалася да суседняга рабочага месца і плюхнула перад сабой падмоклую папку са сцэнарыем, а сама плюхнулася на стул. Папка была з тых бессмяротных, кардонных, што завязваюцца на вяровачкі і маюць клапатлівы надпіс «Дело №», хоць у дадзеным выпадку ўнутры і не «дело» зусім, а заказ.

— Ну ўсё, у мяне пачынаецца калатун, — бездапаможна пралепятала Хрысцінка, адкрываючы папку. — Хоць бы дыялогі паўтарыць ці што...

Яна дрыготкімі рукамі адклала пакет дакументаў, які суправаджаў заказ, і паглыбілася ў сцэнарый (зусім танюткі, не тое што азначаныя дакументы). Толькі задумацца: стосік паперы, косенька раздрукаваны на прынтары, — а ад яго столькі ўсяго залежыць! Ніжняя планка — дыпломны праект, вышэйшую і ўявіць боязна.

АДНАК перачытаць сцэнарый Хрысцінцы не давялося.

— Стук-стук, я не спазнілася? — пачуўся бойкі ўпэўнены голас, і ў студыю пырхнула дагледжаная бландзінка Анжэла — таго тыпу жанчын невызначальнага ўзросту, якім і ў васямнаццаць, і ў сорак гадоў стабільна даеш дваццаць пяць.

Пірат, не зважаючы на прысутнасць рэвізора, гучна пашкадаваў:

— Трэба ж — і гэты раз паспела. Бедная яна, няшчасная, не суджана ёй спазніцца. Ну проста ніяк!

— Не трэніруй на мне сваю з'едлівасць, добранька? Я толькі са здымак, магу і пакусаць, — парыравала Анжэла і павярнулася да вялікага люстэрка. — Цьфу, ізноў сляды ад налобнай камеры! Ну што яна так цісне? Пасля нейкай пары дубляў хоць на вуліцу не выходзь.

Яна адышлася ад люстэрка на колькі крокаў і прыдзірліва ацаніла: ці вельмі прыкметна? Хада ў яе была тая самая, фірмова плыўная, па якой можна здалёк пазнаць тытульную актрысу сну. І зусім не таму, што яны ўсе скрозь зазнаюцца, а таму, што хада — іх прафесійная рыса. Вось паспрабуй зняць сон здавальняючай якасці, калі камера пачэплена на лоб! Без настаўленай хады наздымаеш з такімі хістаннямі, што пры праглядзе ажно будзе кружыцца галава, а гэта добра толькі для сноў-жахлівак і сноў-пагоняў. Таму больш-менш папулярныя кампаніі аддаюць перавагу тым акцёрам, якія маюць адпаведную адукацыю і хоць нейкі вопыт... Нават калі пунктуальнасць кульгае ў іх на абедзве нагі.

ПАШКА, не адрываючыся ад манітора, параіў:

— Дык падключы сваё прыроднае абаянне і выбі нам новыя камеры. Мы ўжо паўгода чакаем, ніяк дачакацца не можам.

— Ты гэта мне ці што? — Анжэла карцінна ўзняла бровы. — Не на той адрас, дружа. Вось шаноўны Раман Сяргеевіч можа выбіць і камеры, і камп'ютары, і розныя там прыбамбасы для пульта кіравання, і суперсучасныя версіі праграм для апрацоўкі... Прычым выбіць нават не выбіваючы нікому зубы, — адным дарам пераканання. Моцна, га? Не рэжысёр, а каштоўнасць. Шчэ і нежанаты... — яна мнагазначна падміргнула свайму адлюстраванню.

Хрысцінка, якая марна спрабавала засяродзіцца на паўтарэнні, нарэшце капітулявала і з надзеяй запыталася:

— А ніхто не ведае, калі ён будзе?

— Да заўтра можна не чакаць, — расчаравала яе Анжэла. — Усё-ткі дзяржзаказ, натурныя здымкі поўным ходам...

— У такі лівень? — захоплена вылупіў вочы Пірат. — От будзе камусьці сон!

МАБЫЦЬ, Хрысцінка не выглядала б такой ашаломленай, нават калі б яе вытурылі з універсітэта за пяць хвілін да ўручэння дыплома.

— Не, стоп, як жа гэта... Раман Сяргеевіч абяцаў! Я і за сцэнарый яшчэ не ўзялася, а ён ужо запэўніў, што прыйдзе на зацвярджэнне. Не можа ён так проста...

— Прабачце, — нечакана перарваў яе рэвізор, не верачы сваім вушам. — Вы хочаце сказаць, што кіраўнік праекта будзе адсутнічаць?

Дагэтуль ён яшчэ стрымліваўся, пакорліва выслухваючы асабістыя размовы работнікаў, але цяпер... Не, скайдрымаўцы дакладна пабілі ўсе рэкорды па бестактоўнасці!

SEX=БАЛЯСЫ

# НАСТАЎніцкае НЮ

**...Не, не падумайце нічога такога, толькі зірнуўшы на загаловак: педагогаў я вельмі паважаю, працу іх цаню. Ды і другая палавінка мая па першай адукацыі настаўніца, усё жыццё асвятляе праблемы ў гэтай сферы, пастаянна камунікуе з дзейнымі педагогамі. Так што каму, як не мне, ведаць пра іх нават на прыкладзе ўласнай сям'і? («— Падчас кожнай нашай сваркі жонка становіцца гістарычкай... — Можа, істэрычкай? Не, менавіта гістарычкай. Яна прыгадвае ўсе мае касякі з дакладнай датай і часам».) А яшчэ я ведаю, што ў знаёмых маёй жонкі, якія працуюць настаўнікамі, — выдатнае пачуццё гумару. («Проста не вучы фізіку ў школе, і ўсё тваё жыццё будзе напоўнена цудамі і чарадзействам.») Спадзяюся, што яго не бракуе і ў іншых, бо інакш тады бяда... («Настаўнікі матэматыкі б'юць трывогу. У пункце А скончыліся аўтобусы».)**

Дык вось, вяртаючыся да таго, адкуль узнікла тэма гэтых нататак. Апошнім часам у прэсе пачасціліся гісторыі, звязаныя са скандаламі вакол педагагічных работнікаў. Не тое каб іх стала больш, тут жа яшчэ трэба разабрацца ў прычынах. («Галоўнае правіла матэматыкі: калі рашаецца лёгка, значыць, рашаеш няправільна».) Відавочна, сказалася заканчэнне чарговага навучальнага года, і настаўнікі, і выхавальнікі дазволілі сабе крыху расслабіцца з гэтай нагоды. («Завуч: — Марыя Іванаўна, чаму у вас Вовачка дыктоўкі мала таго, што з памылкамі піша, дык яшчэ і з мацюкамі? — Ну як вам растлумачыць, Элеанора Пятроўна... Хлопчык піша, памыляецца, нервуецца, пачынае мацюкацца, піша далей...»)

Ва Украіне маладую выхавальніцу дзіцячага сада звольнілі з працы за фота ў купальніку ў сацыяльных сетках. Тая гэтага так не пакінула. («Настаўніца этыкі трапіла малатком сабе па пальцы і на паўгадзіны стала настаўнікам працы».) Суд аднавіў маладую жанчыну ў пасадзе, а загадчыца садка зноў яе звольніла. Усё па прычыне быццам бы зноў жа амаральных здымкаў у сеціве... Звольненая са школы за публікацыю ў сваім «Інстаграме» таксама за фатаграфіі ў купальніку омская настаўніца будзе адноўлена на працы да пачатку новага навучальнага года. («Вока толькі перастала торгацца, а на носе зноў першае верасня».)



26-гадовая выкладчыца адной са школ Омска, якая ў вольны час вучылася ў мадэльнай школе, выклала свой здымак у закрытым купальніку. Кіраўніцтва навучальнай установы прапанавала жанчыне звольніцца па ўласным жаданні, пагражаючы звальненнем па артыкуле, аднак умяшалася рэгіянальнае Міністэрства адукацыі. («— Ну чаго ты пачынаеш, га? Нармальна ж сядзелі, гутарылі... — Вы на білет адказваць будзеце?») Больш за тое, у сеціве разгарнуўся флэшмоб у яе падтрымку: іншыя педагогі пачалі выкладваць уласныя здымкі ў купальніках пад лозунгам «Настаўнікі — таксама людзі». Прычыніліся да акцыі нават некаторыя педработнікі-мужчыны ў купальных касцюмах. («У дзяцінстве я быў вельмі рызыкоўным пацаном. Я пісаў «дамашку» адразу ў чыставік».)

Што мы маем у сухім астатку? Настаўнікі — дарослыя людзі, якія маюць права на асабістае жыццё. («Не хачу дадому, бо там яшчэ ўрокі рабіць», — бурчэла сабе пад нос маці, ідучы з работы».) Падлеткам таксама не ўсё трэба ведаць пра апошняе. («Як навучыць дзяцей добраму?! Калі Тарзан ходзіць голы, Папялушка прыходзіць дадому пасля поўначы, Бэтмен ганяе на хуткасці 450 кіламетраў за гадзіну, а Беласнежка ўвогуле спіць з сямю гномамі. Жах!») Няпростая сітуацыя? («Школьная праграма зараз выглядае так: ляцелі два вярблюды, адзін руды, другі налева. Колькі важыць кілаграм асфальту, калі вожыку чатыры гады?»)

Аднымі забаронамі нічога не дабіцца. Забаронены плод, як вядома, салодкі. Гэта не ўчора адбылося. («Перш чым сварыцца на дзіця, прыгадай сябе ў яго ўзросце, пагладзь па галаве, пацалуй і ідзі пі сваю валяр'янку».) Дастаткова ўспомніць савецкі фільм «Дарагая Алена Сяргееўна». Памятаеце, калі выпускнікі прыйшлі да сваёй настаўніцы не столькі павіншаваць яе з днём нараджэння, колькі цынічна прымусіць выправіць адзнакі ў выпускных работах, да якіх педагог мела доступ? У наш час усё яшчэ прасцей. У Мінскай вобласці школьнік... узламаў старонку сацыяльнага педагога ў сацыяльнай сетцы і шантажыраваў яго. («Васьмікласніца Пятрова села пісаць сачыненне «Як я правяла лета». Напісала загаловак, падумала і на ўсялякі выпадак дапісала «18+».) Але і адмысловы флэшмоб наставіць у сеціве больш здымкаў у купальніках у падтрымку калег, мабыць, таксама не выйсце. Як і нервовая рэакцыя на ўсё гэта кіраўніцтва навучальных устаноў. Гэта тупіковы шлях. («Зачытаўся ўчора на ноч слоўнікам сінонімаў. Як жа крыўдна, горка, недарэчы, прыкра і сумна было сёння прачнуць».)

...Напрыканцы прапаную прыгадаць камедыю з Камеран Дыяс «Вельмі дрэнная вучылка». Стужка быццам пра цынічную і вульгарную настаўніцу, якую не турбуюць ні ўрокі, ні вучні, а толькі адны забавы і кавалеры. («Навучэнка каледжа так хутка лузала семкі, што захлынулася алеем».) Аднак галоўная ідэя фільма ў тым, што не трэба даваць сваім вачам і рабіць паспешлівыя высновы. Як акажацца, эгацэнтрычная бландзінка ў скураной міні-спадніцы можа цікава выкладаць літаратуру. А вы кажаце! («Вучыце табліцу множання, а то разбудзіць вас пасярод ночы, а вам і сказаць няма чаго».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «МЫ ЗНАЁМЫЯ ЎСЁ ЖЫЦЦЁ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Як адпачываеце ад працы?***

**Тэа:** — Для мяне самае лепшае — гэта сон. А яшчэ я лічу, што часам трэба ладзіць «лянівыя дні», каб аднавіць свае сілы. Калі ты проста праводзіш час перад тэлевізарам — звычайна мы яго не глядзім, на гэта проста няма часу, — але ў такія дні — чаму б і не.

**Вольга:** — У нас ёсць такое паняцце — «наша нядзеля». З'явілася яно, калі мы з Тэа пажаніліся. Да гэтага, шчыра кажучы, на нядзелю я часта прызначала здымкі, інтэрв'ю і рэдка калі адпачывала.

Зараз жа, нават калі муж вырашае паспаць, я магу сустрэцца з сяброўкамі, прайсціся па крамах. Для мяне нявыхад з дому цягам дня-двух пагражае адчуваннем таго, што я прапускаю нешта важнае.

Дарэчы, у Тэа ёсць адзін від адпачынку, у якім я наогул не ўдзельнічаю, — гэта рыбалка на Прыпяці.

**Тэа:** — Я не з тых людзей, хто хацеў бы пабудаваць дом у глухім лесе і з'ехаць туды жыць. Але я вельмі люблю прыроду. Мяне сапраўды ўражвае нацыянальны парк «Прыпяцкі». І еду я туды не столькі па рыбу, колькі для таго, каб атрымаць асалоду ад усяго, што мяне акружае.

***— Якое ў вас хобі?***

**Вольга:** — Калісьці я пісала вершы, і яны, а таксама спяванне, былі маім захапленнем. Зараз жа гэта частка працы. А так — вось катаемся на веласіпедах. Мінулым летам, дарэчы, устанавілі ўласны рэкорд: даехалі ад парку Перамогі да Чыжоўкі.

***— Вы кантактавалі і да таго, як сталі парай. А як зразумелі, што гэта каханне?***

**Вольга:** — О, я хацела б паслухаць... *(Смяецца.)*

**Тэа:** — Сапраўды, мы бачыліся вельмі часта па працы на працягу многіх гадоў. І мне складана дакладна сказаць, калі менавіта гэта здарылася... Хоць у Волі, напэўна, ёсць на гэта пытанне адказ з дакладнай датай: «Вось у той дзень ён неяк па-асабліваму на мяне паглядзеў!»

**Вольга:** — Як чалавек і музыкант Тэа спадабаўся мне з першай сустрэчы. Але я ніколі не магла ўявіць, што ён можа быць спакойным сямейным чалавекам. Юра здаваўся мне...

**Тэа:** — ...разгільдзяем!

**Вольга:** — ...вясёлым, лёгкім, але легкадумным. Памятаю, я яшчэ думала тады: вось калі дамовіцца з ім аб спатканні, ён жа забудзе пра яго!

**Тэа:** — А Воля мне падалася падчас знаёмства юнай і вельмі адказнай. Яна заўсёды сачыла за тым, ці адправіў я запіс, ці зрабіў тое, што абяцаў.

***— Калі вы пачалі сустракацца, пажаніліся, ці змянілася ваша творчасць? Ці сталі сумесныя песні больш рамантычнымі?***



**Тэа:** — Адназначна. У дуэтах заraз адлюстроўваецца наша з Воляй гісторыя, настрой, у якім мы цяпер знаходзімся. Пісаць пра тое, што ты на самай справе адчуваеш, заўсёды больш цікава для слухача, бо гэта ўсё сапраўднае, не выдумка.

**Вольга:** — Цяпер было б дзіўна пачуць ад нас з Тэа дуэтную песню пра разбітае сэрца. Наогул, у Тэа вельмі мала сумных кампазіцый.

**Тэа:** — Я не люблю пакутаваць. Люблю добрыя пазітыўныя эмоцыі. Праблем у жыхароў планеты больш чым дастаткова. Таму музыка павінна быць скіравана на тое, каб падняць настрой.

***— Ёсць меркаванне, што супрацьлегласці прыцягваюцца. У вас здарылася так жа?***

**Тэа:** — Гледзячы ў чым. Калі казаць пра музыку, то ў нас зусім розныя музычныя густы, як гэта ні дзіўна. Тое, што падабаецца мне, як правіла, не падыходзіць Волі. Я люблю ацэньваць кампазіцыю: наколькі яна актуальная, ці ў трэндзе. Волі ж песня проста падабаецца ці не падабаецца. І ў гэтым няма нічога дрэннага.

**Вольга:** — Мне падабаюцца як новыя песні, так і старыя, якія звычайна любяць людзі старэйшага ўзросту. Часам Юра нават кажа: «Табе колькі гадоў?»

Нашыя густы разыходзяцца, дарэчы, і ў ежы...

**Тэа:** — Воля прывучыла мяне да салатаў. Я заўсёды думаў, што салата — гэта калі ў вялікай талерцы намяшана шмат агародніны, якая запраўлена, напрыклад, смятанай. Пасля жаніцьбы я зразумеў, наколькі памыляўся. Цяпер ем салаты з рукалы, палюбіў сельдэрэй.

**Вольга:** — Што датычыцца нейкіх жыццёвых пазіцый і разумення дабра і зла, тут мы заўсёды сыходзімся ва ўсім.

У мяне і ў Юры нават сем'і падобныя. У кожнага з нас ёсць старэйшы брат. І ў нейкіх сваіх дзіцячых успамінах у нас шмат агульнага, мы адно аднаго разумеем. Нашыя з Тэа бацькі аднойчы сказалі, што ёсць такое адчуванне, быццам мы знаёмыя ўжо вельмі даўно, ледзь не ўсё жыццё.

***— Хто галоўны ў вашай сям'і?***

**Тэа:** — У нас абсалютная дэмакратыя. Усе спрэчныя пытанні мы заўсёды абмяркоўваем. Лічу, што так і павінна быць.

Але вось зараз дам параду мужчынам: пры ўсім вашым вопыце і важкіх аргументах трэба не забываць аб жаночай інтуіцыі.

***— Напэўна, у кожнага з вас шмат паклоннікаў і паклонніц. Ці раўнуеце адно аднаго?***

**Тэа:** — Усё залежыць ад артыста, таго, як ён сябе пазіцыянуе і паводзіць. Калі паказвае, што адкрыты да любых учынкаў з боку паклонніц, — гэта адна справа. Я ж выбіраю варыянт правільнага выбудоўвання стасункаў, першапачаткова пазначаю межы. Але калі шчыра, то ў адносінах да сябе якіх-небудзь незвычайных сітуацый, звязаных з паклонніцамі, я і не ўспомню.

**Вольга:** — Напэўна, пасля вяселля іх стала менш... *(Смяецца.)*

Я магу сказаць, што калі толькі пачалі сустракацца (а мы доўга хавалі гэта, не афішавалі), безумоўна, тады актыўнасць паклонніц і паклоннікаў была значна вышэйшая, чым зараз. Сёння ж, напрыклад, фан-клуб, які быў калісьці фанклубам Тэа, стаў і маім. Я неяк так арганічна ў яго ўлілася. Нас абаіх віншуюць са святамі, разам запрашаюць на сустрэчы.



Наконт рэўнасці скажу, што трэба давяраць, але трымаць вуха вострa, бо ў Беларусі, я лічу, жывуць самыя прыгожыя дзяўчаты. Дарэчы, гэта стымулюе мяне трымаць сябе ў форме. Таму скажу, што рэўнасць павінна быць, але здаровая, без хваравітых праяў. Бо, напрыклад, калі Тэа тэлефануе мне і гаворыць, што зараз на здымках і не ведае, калі яны скончацца, я ўспрымаю гэта нармальна. Мы абое артысты і разумеем нейкія моманты, звязаныя з нашай прафесіяй.

**Ганна БАГІНО.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.06.2018 г.

■ Векапомнае

# Байцам апошняга «Баявога разліку»

## Брэсцкі раён аказаўся першым на шляху захопнікаў

**Заўтра ў Брэсце адзначаць 77-ю гадавіну пачатку вайны. Па традыцыі, якой больш за паўвека, на досвітку ў крэпасці пройдзе мітынг-рэквіем. Пасля — рэканструкцыя падзей таго далёкага чэрвеньскага дня.**

У гэты дзень людзі збіраюцца ў Брэсцкай крэпасці яшчэ да раніцы. А палове на чацвёртую, калі з розных канцоў горада пачынаюць падцягвацца гараджане, яшчэ стаіць начны змрок, не спяваюць птушкі, цытадэль сустракае напружанай цішынёй. Тады ахоплівае асаблівае пачуццё, відаць, яго можна назваць пачуццём вайны. Яна прыйшла, абрынулася ў такі ж перадсвітальны час. І пачуццё гэтае нарастае, захоплівае, трывожыць...

### За радком мемуараў

Даўнавата ўжо ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці давялося гартаць старонкі кнігі нямецкага гісторыка П. Карэла. Ён адзін з тых, што наступалі на брэсцкім напрамку ў 1941 годзе. Гэтыя радкі і сёння выклікаюць дрыжыкі: «Было тры гадзіны 12 хвілін. Кожны глядзеў на цыферблат. У кожнага быў камяк у горле. У кожнага пачашчана білася сэрца. Цішыня была невыноснай. 3 гадзіны 13 хвілін. Яшчэ было не позна змяніць ход падзей. Пачатак незваротнага яшчэ не адбыўся. Але далей паўзлі па цыферблаце стрэлкі, і вайна супраць Савецкага Саюза, які ляжаў наперадзе, у мёртвай цішыні, набліжалася няўхільна. 3 гадзіны 14 хвілін. Як прывід, драўляная вежа Вулькі Дабрыньскай вызначалася на фоне неба. Першае бледнае святло з'явілася на гарызонце. Мёртвая цішыня ўсё яшчэ панавала па ўсім участку групы армій «Цэнтр». Лясы спалі. Палі былі спакойныя... Роўна ў 3.15 пачаўся ўраган і пранёсся над нашымі галовамі з такой сілай, якой мы ні разу не адчувалі ні да гэтага, ні ва ўсім наступным ходзе вайны. Гэты гіганцкі канцэнтраваны агнявы вал літаральна скалынуў зямлю. Над цытадэллю як грыбы выраслі густыя чорныя фантаны зямлі і дыму».

Так гэта бачылася з боку тых, хто прынёс сюды смерць. А ў крэпасці, напрыклад, дзясяткі людзей загінулі, нават не паспеўшы зразумець, што здарылася. І не толькі ў крэпасці. Згаданы нямецкім мемуарыстам гіганцкі агнявы вал абрынуўся таксама і на навакольныя вёскі, на пагранічныя заставы, якія знаходзіліся ўздоўж мяжы. У вёсках загарэліся хаты, у пошуках ратунку людзі беглі ў поле і лес. Карэл у сваёй кнізе згадвае не толькі Вульку Дабрыньскую, яшчэ Кацельню Баярскую, іншыя населеныя пункты. Дык вось Вулька Дабрыньская цяпер знаходзіцца з польскага боку, а Кацельня Баярская — у Брэсцкім раёне, амаль на самай мяжы. Толькі апошні карэнны жыхар вёскі ўжо адышоў у іншы свет, а нябедныя брастаўчане, якія пабудавалі там летнія дамы, пра вайну расказаць не могуць.

### Застава каля вёскі Чылеева

Што здзіўляцца? 77 гадоў прайшло. Але і праз столькі гадоў унук капітана Грыненкі, абаронцы 5-й памежнай заставы, якая дыслацыравалася каля вёскі Чылеева, шукае магілу свайго дзеда. Байцы чылееўскай заставы аднымі з першых сустрэлі вайну, большасць з іх загінула. А родныя Сямёна Грыненкі атрымалі паведамленне, што іх муж і бацька прапаў без вестак. Самая крыўдная фармулёўка таго часу. Бо выраз «прапаў без вестак» мае нейкую двухсэнсоўнасць. Жонка Сямёна Максімавіча Марыя Уладзіміраўна, пакуль жыла, спрабавала адшукаць магілу мужа. Ёй дапамагала дачка Ала Сямёнаўна Пічугіна. Справу працягнуў унук франтавіка расіянін Аляксандр Пічугін.

Некалькі гадоў таму Аляксандр звярнуўся ў брэсцкія газеты, у савет ветэранаў з просьбай дапамагчы, падзяліцца звесткамі. Многае праяснілася. Напрыклад, у кнізе Уладзіміра Цяльца «Мяжа 41», а таксама ў кнізе «Памяць. Брэсцкі раён» падрабязна апісаныя апошнія дні і апошнія гадзіны чылееўскай заставы.

Пятая застава 17-га Чырванасцяжнага пагранічнага атрада ахоўвала ўчастак мяжы па рацэ Заходні Буг працягласцю шэсць кіламетраў. Літаральна за дзень да вайны на заставу прыбылі начальнік 1-га аддзялення штаба атрада капітан Грыненка і палітрук аддзела прапаганды атрада Грачухін. Камандаванне лічыла гэты ўчастак надзвычай важным, таму ўзмацненне яго было праведзена яшчэ ў маі, сюды камандзіравалі 3-і батальён 125-га стралковага палка 6-й дывізіі. Усяго на заставе з улікам узмацнення было сабрана больш за 100 чалавек. 21 чэрвеня байцы капалі акопы, ставілі абарончыя збудаванні, а на світанні пачалася бамбёжка, і немцы пайшлі ў наступленне.

Камандаванне абаронай, як старшы па званні і пасадзе, прыняў капітан Грыненка. Пагранічнікі сустрэлі ворага кулямётным агнём і змаглі адбіць першую атаку, але сам капітан падчас бою загінуў. Пасля гэтага камандаванне ўзяў на сябе лейтэнант Багамаз — начальнік чылееўскай заставы. Немцы, крыху ачомаўшыся, пусцілі ў ход артылерыю і пад прыкрыццём агню акружылі заставу. Потым пайшлі танкі. Калі стала відавочна, што далей стрымліваць наступленне праціўніка немагчыма, было прынятае рашэнне выходзіць з акружэння. У групе прыкрыцця было 20 байцоў на чале з палітруком Сарокіным. Амаль усе яны загінулі, цяжкапараненыя трапілі ў палон. Усяго некалькі чалавек здолелі адысці ў бок Лышчыц. Некаторыя параненыя дабраліся да Чарнаўчыц, тутэйшы фельчар Сарачынскі ў сваім доме арганізаваў шпіталь. Ён лячыў і Пятра Багамаза. Немцы даведаліся пра лазарэт і аднойчы «завіталі» ў двор да Сарачынскага. Не цяжка ім было высветліць, хто гэтыя цяжкапараненыя. Але прыняўшы да ўвагі той факт, як стойка трымаліся вартавыя мяжы, іх не сталі чапаць, не зачапілі і фельчара. Пазней ён будзе ўзнагароджаны медалём «За адвагу». А Багамаз падлечыўся, дабярэцца да фронту, будзе гераічна ваяваць і загіне пры вызваленні Пскоўскай вобласці.

### Помніць — вечна

У сярэдзіне 60-х гадоў рэшткі многіх загінулых у першыя дні вайны і пры вызваленні звозілі ў брацкую магілу ў вёсцы Чарнаўчыцы. Але на гэтай магіле імёны байцоў 5-й заставы не значацца. І толькі нядаўна мясцовыя краязнаўцы высветлілі, што загінулыя пагранічнікі знаходзяцца ў зямлі вакол чылееўскай заставы. Там, вядома, патрэбны памятны знак. Але ж для гэтага належыць правесці вялікую работу, перш за ўсё, пошукавую. Бо, як вядома, вайна не скончана, пакуль не знайшоў супакаенне апошні яе салдат.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Сярод байцоў 5-й заставы, тых, хто застаўся каля вёскі Чылеева навечна, былі і зусім юныя. Згадваю словы загадчыцы экспазіцыі «Музей вайны — тэрыторыя міру» ў крэпасці Алены Грыцук: «Як вядома, у 41-м на вайну прызывалі ўжо юнакоў 1923 года нараджэння, тых, каму споўнілася васямнаццаць. Дык вось са ста франтавікоў згаданага года нараджэння ў жывых застаўся толькі адзін...»

Вось для гэтага і праводзяцца Дні памяці, каб не забываць 99 — з сотні юных, і старэйшых, тых, хто сустрэў вайну і загінуў у крэпасці, хто мужна змагаўся за кожны метр зямлі на пагранічных заставах, і мірных жыхароў, якія палеглі, бо аказаліся на шляху захопнікаў. Дарэчы, брэсцкія пагранічнікі ў гонар папярэднікаў, якія загінулі ў 41-м, праводзяць акцыю «Баявы разлік». 21 чэрвеня яны заступаюць у ганаровы «Баявы разлік» на зямлі крэпасці, каб успомніць байцоў, для якіх той разлік па абароне рубяжоў краіны аказаўся апошнім ■

*Чакалі ў спякоце*
*прыціхлыя травы,*
*Углядаліся ў далеч старыя дубы —*
*Адкуль прыплывуць*
*ратавальныя хмары?*
*Адкуль прынясуць прахалоду вятры?*

*Чаканне дажджу...*
*Лёс пазначыў чаканнем*
*Каханне і здрады*
*для кожнага з нас.*

*І час нараджэння,*
*і час развітання —*
*Усё праз чаканне прыходзіць штораз.*

*І дождж прыляцеў.*
*Той, што ўсімі чакаўся,*
*У спёку для кожнага*
*мараю быў —*
*Ён цешыўся кветкамі,*
*з дубам шаптаўся*
*І шчодра брыльянты*
*дажджынак дарыў.*




■ Да тэмы

### Імгненні стагоддзя

**У Брэсце адкрылася фотавыстаўка, прымеркаваная да 100-гадовага юбілею Беларускага тэлеграфнага агенцтва.**

Вернісаж праходзіць у кінатэатры «Беларусь» на вуліцы Савецкай. Менавіта тут штогод 22 чэрвеня пачынаюцца мерапрыемствы, прысвечаныя Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Аўтары выстаўкі прапанавалі гледачам эксклюзіўныя здымкі Брэста, зробленыя ў 1944 годзе, а таксама фатаграфіі Брэсцкай крэпасці розных гадоў. Цэнтральнай часткай выстаўкі сталі 36 шырокафарматных фатаграфій, якія адлюстроўваюць асноўныя вехі гісторыі Беларусі з 1918 года да нашага часу.

— Выстаўка цікавая для нас найперш тым, што тут прадстаўлена Брэсцкая крэпасць, — заўважыла на адкрыцці **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Таццяна ГАГАКАВА**. — Гераічныя старонкі мінулага выклікаюць не толькі цікавасць, але і гонар за сваю гісторыю і жаданне даведацца больш пра малую радзіму.



Фота БелТА.

■ Каб помнілі

### ЗАЎТРА БЫЛА ВАЙНА

**Больш за 500 рэканструктараў ваенных падзей збіраюцца ў Брэсце, каб у ноч на 22 чэрвеня аднавіць падзеі 77-гадовай даўніны. Свой злёт яны так і назвалі «22 чэрвеня. Брэсцкая крэпасць».**

Па традыцыі ўдзельнікі ваенна-гістарычных клубаў аднаўляюць падзеі апошняга мірнага дня. У другой палове чацвярга яны пройдуць ад Брэсцкай крэпасці па вуліцах Зубачова і Гогаля да Савецкай. На Савецкай у гэты час іграе музыка 40-х гадоў, прагульваюцца парачкі ў адзенні таго часу.

Галоўная ж дзея разгорнецца на Кобрынскім умацаванні Брэсцкай крэпасці. Пасля мітынга-рэквіема ў пяць гадзін раніцы пачнецца рэканструкцыя абароны легендарнай цытадэлі.

Падзеі той страшнай ночы пакажуць аматары гістарычных рэканструкцый з Беларусі, Расіі, Украіны, Ізраіля, Аўстрыі, Японіі, Кітая, Эстоніі, Латвіі, іншых краін.

**Матэрыялы падрыхтавала**
**Святлана ЯСКЕВІЧ** ■

# БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

## ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ, ЗАОЧНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) И ДОКТОРАНТУРУ (ДНЕВНУЮ И В ФОРМЕ СОИСКАТЕЛЬСТВА) ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В 2018 ГОДУ.

УНП 100235722

**План приема лиц для получения послевузовского образования за счет средств республиканского бюджета на 2018 год в Белорусском государственном университете**

| Организация-заказчик | Шифр специальности | Аспирантура | | | | Докторантура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Всего | Из них по форме обучения | | | Всего | Из них по форме обучения | |
| | | | Дневная | Заочная | Соискательство | | Дневная | Соискательство |
| Белорусский государственный университет | 01.01.01 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.01.02 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» | 01.01.02 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Белорусский государственный университет | 01.01.05 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.01.09 | 2 | 2 | | | 1 | 1 | |
| Комитет государственной безопасности Республики Беларусь | 01.01.09 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.02.04 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.02.08 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.04.02 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.04.03 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.04.05 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.04.10 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 01.04.21 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| РУП «Научно-практический центр гигиены» | 02.00.02 | 2 | | | 2 | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.03 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.04 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.06 | 2 | 2 | | | 1 | 1 | |
| ОАО «Лесохимик» | 02.00.06 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.09 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 02.00.21 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.01.02 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.01.03 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.01.04 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.01.05 | 3 | 3 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.01.07 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| ГУ «Научно-практический центр Государственного комитета судебных экспертиз Республики Беларусь» | 03.01.07 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 03.02.03 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина» | 03.03.01 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 05.13.01 | 3 | 3 | | | 1 | 1 | |
| Белорусский государственный университет | 05.13.11 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 05.13.17 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 05.13.18 | 3 | 2 | 1 | | 0 | | |
| ОАО «ИНТЕГРАЛ» | 05.13.19 | 1 | | 1 | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 05.13.19 | 2 | 2 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 05.25.02 | 1 | 1 | | | 0 | | |
| ГУ «Национальный архив Республики Беларусь» | 05.25.02 | 1 | | | 1 | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 07.00.02 | 5 | 5 | | | 0 | | |
| ГУО «Университет гражданской защиты» | 07.00.02 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Министерство спорта и туризма Республики Беларусь | 07.00.02 | 1 | | 1 | | 0 | | |
| УО «Белорусский государственный аграрный технический университет» | 07.00.02 | 0 | | | | 1 | 1 | |
| УО «Брестский государственный технический университет» | 07.00.02 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| УО «Международный государственный экологический институт имени А. Д. Сахарова» БГУ | 07.00.02 | 0 | | | | 1 | | 1 |
| Белорусский государственный университет | 07.00.03 | 7 | 7 | | | 0 | | |
| Белорусский государственный университет | 07.00.06 | 2 | 2 | | | 0 | | |
